ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 44 (2097)
31 мая 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПСС

26 і 27 мая Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС працягваў сваю работу.

Абмяркоўваўся даклад міністра меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР Я. Я. Алексяеўскага «Аб шырокім развіцці меліярацыі зямель для атрымання высокіх і ўстойлівых ураджаяў збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур».

На Пленуме з прамовай выступіў Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта КПСС тав. Л. І. Брэжнеў.

Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС аднадушна прыняў пастанову «Аб шырокім развіцці меліярацыі зямель для атрымання высокіх і ўстойлівых ураджаяў збожжавых і іншых сельскагаспадарчых культур».

На гэтым Пленум закончыў сваю работу.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЛЕТА

І. ПАЛІВОДА,
начальнік Упраўлення па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР

Тэатр заканчвае сезон і пачынае яго зноў — гастролямі. Такая практыка тэатра.

Мы шмат гаворым і пішам пра пачатак сезона і амаль нічога — пра яго канец. А між тым перыяд гэты, асабліва перыяд, які папярэднічае пачатку летніх гастроляў, — вельмі адказны ў жыцці кожнага тэатральнага калектыву.

Простае меркаванне: на сваіх падмостках тэатр заўсёды дома, у яго пастаянны глядач, на чужых жа — гледача трэба заваёўваць зноў і зноў, тут сцены не дапамагаюць.

Дык можа шукаць непатрабавальнага гледача на старане, ехаць туды, дзе ўсё «сыдзе»?

Наўрад ці пажадае сабе такое сур'ёзная трупа.

Давайце паглядзім, якія глядзельныя залы чакаюць нашы тэатры гэтым летам, куды накіроўваюцца нашы калектывы.

Дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета — Растоў-на-Доне, Сочы;

Дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы — Брэст, Кіеў;

Дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа — Мінск;

Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага — Віцебск;

Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі — Вінніца, Хмяльніцкі;

Гомельскі абласны драматычны тэатр — Кіеў, Чарнаўцы;

Гродзенскі абласны драматычны тэатр — Магілёў, Бабруйск;

Магілёўскі абласны драматычны тэатр — Віцебск;

Магілёўскі абласны тэатр музычнай камедыі — Віцебск, Смаленск, Даўгаўпілс, Рыга...

Няцяжка заўважыць, што тэатры, усе без выключэння, атрымалі вельмі адказныя гастрольныя маршруты, і ў радзе выпадкаў гаворка можа ісці не толькі аб «роўных», але і больш «высокіх» сцэнічных пляцоўках.

Упершыню, напрыклад, мы запрашаем да сябе Кіеўскі драматычны тэатр імя Івана Франка, а ў Кіеў з візітам у адказ едзе Тэатр імя Янкі Купалы. Рэспубліку будуць прадстаўляць перад суседзямі калектывы Гомельскага, Брэсцкага, Бабруйскага тэатраў.

Сёлетнія гастролі — гастролі асаблівыя. Яны папярэднічаюць сезону 1967 года, юбілейнага года Савецкай улады. Тое, што тэатры будуць рэпеціраваць на гастролях, па сутнасці ўвойдзе ў святочны рэпертуар. Значыць, максімум увагі павінна быць аддадзена рэпетыцыям, працы тых акцёраў, якія будуць занятыя ў новых пастаноўках. Вядома, напрыклад, што Рускі драматычны тэатр у час гастроляў пачынае работу над спектаклем «6 ліпеня», Брэсцкі тэатр — над ленінскім спектаклем «Дзень цішыні», Тэатр оперы і балета працуе над аднаўленнем «Дзяўчыны з Палесся». Мы з нецярплівасцю будзем чакаць вяртання гэтых тэатраў, каб пазнаёміцца з гэтымі новымі работамі.

Тэатры рэспублікі атрымалі перад летнімі гастролямі канкрэтныя заданні па абслугоўванню сельскіх гледачоў. Тэатры імя Янкі Купалы і імя Максіма Горкага, напрыклад, у чэрвені—ліпені будуць выступаць перад калгаснікамі вобласці, Тэатр юнага гледача — у Віцебскай і Гродзенскай абласцях, Брэсцкі драматычны тэатр будзе абслугоўваць калгасы сваёй вобласці і г. д. Калегія Міністэрства культуры звярнула асаблівую ўвагу тэатраў на ўзорнае забеспячэнне гэтых гастроляў як важнай часткі ўсёй нашай культурна-масавай работы на вёсцы, значэнне якой асабліва падкрэслівае XXIII з'езд КПСС.

У час гастроляў тэатры будуць наладжваць творчыя сустрэчы з калектывамі прадпрыемстваў, калгаснікамі, навучэнцамі, воінамі Савецкай Арміі. Важна, каб на гэтых сустрэчах гаворка ішла не толькі аб ранейшых работах тэатраў, але і аб тых спектаклях, якія рыхтуюцца да 50-годдзя Савецкай улады.

Як заўсёды, на гастролях набывае асабліва значэнне гаспадарча-фінансавая дзейнасць тэатраў. Але гэту дзейнасць нельга аддзяляць ад творчага жыцця калектываў, правільнай рэпертуарнай палітыкі.

Гастролі — па сутнасці другі сезон тэатра, і каб правесці іх узорна, ад кожнага члена тэатральнага калектыву патрабуецца максімальная аддача. Вядома, што заваёўваць сэрцы — нялёгка. Але гэта і ёсць вышэйшае прызванне тэатра, прызванне мастацтва.

НА ГАСТРОЛЬНЫХ МАРШРУТАХ

Растоўскі-на-Доне абласны драматычны тэатр імя М. Горкага — першы тэатр, які адкрыў летні гастрольны сезон у Беларусі. Акрамя Мінска, растаўчане, як вядома, будуць выступаць у Гомелі. У Гомелі ж у чэрвені будуць праходзіць гастролі Харкаўскага тэатра музычнай камедыі. Далейшы маршрут гэтага тэатра — Магілёў (ліпень) і Мінск (жнівень).

У ліпені ў беларускай сталіцы пачнуцца гастролі Украінскага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Івана Франка.

У Віцебску ў жніўні плануюцца гастролі Крымскага ўкраінскага музычна-драматычнага тэатра. Драгобыцкі ўкраінскі музычна-драматычны тэатр выступіць у Брэсце (ліпень) і Гродна (жнівень). У чэрвені ў Гродна пройдуць гастролі Вялікалуцкага драматычнага тэатра.

НІЛ ГІЛЕВІЧ — КАВАЛЕР БАЛГАРСКАГА ОРДЭНА

Нашы чытачы добра ведаюць Ніла Гілевіча, як аўтара задушэўных лірычных вершаў, аўтара глыбокіх артыкулаў па праблемных пытаннях літаратуры і мастацтва. Добра вядома і яго даўняя цікавасць да братняй Балгарыі, да яе гісторыі, літаратуры.

Ніл Гілевіч шмат зрабіў для таго, каб пазітычнае слова балгарскіх сяброў шырока гучала на беларускай мове. У 1965 годзе выдавецтва «Беларусь» выпусціла зборнік перакладаў паэта з балгарскай мовы «Ад стром балканскіх».

Днямі з Сафіі прыйшла вестка, што Прэзідыум Народнага сходу Народнай Рэспублікі Балгарыі за перакладчыцкую дзейнасць узнагародзіў Ніла Гілевіча ордэнам Кірыла і Мефодзія I ступені. Шчыра віншуем яго з высокай узнагародай!

1 ЧЭРВЕНЯ — ДЗЕНЬ АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ

ГОД НАРАДЖЭННЯ — 1960-ы...

Фота Ул. КРУКА.

ПЕРАМОЖЦАЎ НАЗАВУЦЬ СЁННЯ

Усесаюзны кінафестываль у Кіеве заканчвае свой шлях працягласцю ў 10 дзён. Сёння ўвечары ў Кіеўскім палацы спорту будуць названы пераможцы конкурсу, у якім прынялі ўдзел усе кінастудыі краіны. Журы прагледзела каля 30 мастацкіх фільмаў і больш 60 дакументальных і навукова-папулярных стужак.

Але статыстыка фестывалю не вычэрпваецца гэтымі лічбамі, хаця і яны дастаткова пераканаўчыя. У 40 кінатэатрах горада па-за конкурсам ідуць лепшыя карціны выпуску апошніх двух гадоў. На экранах Кіева адбыліся дзесяткі кінапрэм'ер. Кіяўляне першымі ў краіне ўбачылі другую серыю кінаэпапеі «Вайна і мір».

Гледачы прымалі зусім не фармальны ўдзел у фестывалі. Упершыню ў практыцы ўсесаюзных кінаконкурсаў гледачы выступілі яго арбітрамі. Бюро прапаганды кінамастацтва пры Саюзе кінематаграфістаў СССР распаўсюдзіла анкету, дзе было і такое пытанне: які фільм фестывалю вы лічыце лепшым? «За» і «супраць» яшчэ не падлічаны канчаткова, але, паводле папярэдніх дадзеных, апублікаваных у шматтыражцы «Спадарожнік фестывалю», найбольшую колькасць балаў атрымалі фільмы «Ленін у Польшчы» С. Юткевіча і «Ніхто не хацеў паміраць» — В. Жалакявічуса. Засталося зусім нямнога часу, каб зверыць, нарэшце, колькі супадуць (або разыдуцца) ацэнкі аматараў і прафесіяналаў кіно.

Прыкметнай з'явай на фестывалі была карціна Уладзіміра Бычкова «Горад майстроў», прадстаўленая на конкурс кінематаграфістамі Беларусі. Нанкорт фільма існуе, прынамсі, дзве думкі. Большасць лічыць яго вельмі цікавай работай, значным эксперыментам у распрацоўцы вобразнай сістэмы кінамастацтва. Некаторых адпалохвае ўмоўнасць казкі, якая падкрэслена пластычным вырашэннем фільма, разлік яе стваральнікаў на сааўтарства гледача.

Зразумела, канцэпцыя гэтага фільма адкрыецца толькі для тых, хто ўспрымае ў ім не толькі сюжэт. Прыгожа пастаўленая казка з традыцыйным шчаслівым канцом, успрымаецца дзіцячай аўдыторыяй зусім «всамделишно». Як заўважыў у гутарцы з намі Уладзімір Бычкоў, «дзеці вельмі дакладна бачаць у фільме сацыяльныя акцэнты».

Здымаючы фільм, рэжысёр, паводле яго слоў, вырашаў некалькі эстэтычных задач, якія яму здаюцца вельмі важнымі. Пластыка кадра, колеравая і графічнае вырашэнне — усё гэта павінна «працаваць» на галоўную думку фільма.

Кінастудыя «Беларусьфільм» паказала на кіеўскіх экранах фільмы «Праз могілкі», «Альпійская балада», «Колькі летаў, колькі зімаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Калі пільна прыглядзецца да гэтага спісу, мы знойдзем у зусім знаёмасць, характэрную для савецкага кінематографа ўвогуле. Гутарка ідзе аб другім нараджэнні нацыянальнага мастацтва, якое прадстаўлена на кіеўскім конкурсе цудоўнымі ўзорамі. «Малдова-фільм» выступіла з паэтычнай карцінай Вадзіма Дзербянёва і Іона Друцэ «Апошні месяц восені». Цудоўна выступілі ў конкурсе кіргізкія кінадакументалісты, яны паказалі дзесяцімінутную філасофскую паэму «Гэта — конь». Фаварытам фестывалю лічыцца літоўскі фільм «Ніхто не хацеў паміраць» і карціна ўкраінскіх дакументалістаў «Караблі не паміраюць».

У кінаконкурсе разам са старой гвардыяй савецкага кінематографа выступае моладзь. Два гады назад амаль ніхто не ведаў імёнаў Віктара Турава і Віктара Лісаковіча, Барыса Сцяпанава і Андрэя Канчалоўскага, Ларысы Кадачнікавай і Юрыя Ільенкі... Сёння іх ведаюць гледачы, сочаць за іх поспехамі ў мастацтве, шукаюць новых сустрэч з імі.

Е. СЦІШОВА,
Ю. ВАЛУЕЎ,
спецкары ТАСС.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, МІНСК!

Шырокімі прыгожымі вуліцамі, густою зелянінаю паркаў і сквераў гасцінна сустракае Мінск. А калі пачынаецца гастрольнае лета і надвячоркам яшчэ зусім светла, каля ўваходаў ў тэатры можна ўбачыць многа народу: людзі прыходзяць знаёміцца з новымі тэатральнымі калектывамі, цікавяцца новымі пастаноўкамі.

Для калектыву Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа сустрэча са сталічным гледачом — радасная і хвалюючая падзея. Тэатру ўжо даводзілася бываць у Мінску. Апошні раз ён прыязджаў у сталіцу некалькі гадоў назад. Мы ведаем мінчан, як добразычлівых, але патрабавальных гледачоў, якія заўсёды выказвалі глыбокую цікавасць да беларускага тэатральнага мастацтва. І ёсць яшчэ адна акалічнасць, якая абавязвае нас з поўнаю адказнасцю аднесціся да нашых сёлетніх гастролей. У гэтым годзе Тэатр імя Якуба Коласа адзначае 40 год свайго існавання. Дружны тэатральны калектыў прайшоў вялікі творчы шлях, лепшыя старонкі якога ўжо ўпісаны ў гісторыю беларускага савецкага тэатра.

На сцэне тэатра былі пастаўлены многія п'есы беларускіх пісьменнікаў: Якуба Коласа, Янкі Купалы, Кандрата Крапівы, Пятра Глебкі, Кузьмы Чорнага, Віталія Вольскага, Андрэя Макаёнка, Кастуся Губарэвіча, Ільі Гурскага, Аркадзя Маўзона. Разам з тым тэатр ажыццявіў пастаноўку цэлага шэрагу твораў рускай класікі — п'ес М. Горкага, А. Астроўскага, Л. Талстога, М. Гогаля, А. Чэхава. На сцэне тэатра з поспехам ішлі і ідуць п'есы савецкіх пісьменнікаў, многія пастаноўкі ўжо сталі гісторыяй тэатра. Гэта «Разлом» Б. Лаўранёва, «Фронт» А. Карнейчука, «Нашэсце» Л. Ляонава.

У рэпертуар тэатра трывала ўвайшлі творы замежнай класікі — п'есы В. Шэкспіра, Ж. Мальера, П. Кальдэрона і інш. На савецкіх п'есах, на творах класікі рос і сталеў калектыў коласаўцаў. Зараз у тэатры працуе пяць налавек яго заснавальнікаў, якія прайшлі разам з тэатрам вялікі шлях ад першага дня да сённяшніх дзён. Гэта народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Аляксандр Ільінскі, народны артыст БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Цімох Сяргейчык, народная артыстка БССР Алена Радзялоўская, заслужаныя артысты рэспублікі Яніна Глебаўская і Алена Лагоўская. Многа год свайго творчага жыцця аддалі тэатру народныя артысты БССР Мікалай Звездачотаў, Анатоль Шэлег, Анатоль Трус, Фёдар Шмакаў; заслужаныя артысты рэспублікі Іосіф Матусевіч, Зінаіда Канапелька, Елізавета Мацісава.

Поспеху тэатра садзейнічалі артысты старэйшага і сярэдняга пакалення — П. Бялевіч, Я. Буракоў, С. Казлоў, Б. Левін, М. Маркоўская, А. Мельдзюкова.

Калектыў тэатра ўвесь час папаўняўся выпускнікамі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Сярод іх трэба адзначыць Г. Маркіну, Ул. Куляшова, М. Цішачкіна, Т. Кокштыса, Л. Малашкевіч, В. Анісенку, С. Некіпелаву, Н. Левашову, Л. Усанаву, К. Кліменка, З. Ліневіч, І. Вашкевіча. Пасля заканчэння тэатральнай студыі да нас прыйшлі Г. Каралькова, В. Петрачкова, Л. Пісарава і інш. Зараз калектыў нашага тэатра можна лічыць маладым, бо моладзь складае больш палавіны трупы.

У Мінск мы прывезлі самы разнастайны рэпертуар. Гэта агульна-вядомы маляўнічы спектакль «Несцерка», які ідзе на сцэне тэатра 25 год і паказваўся больш за 300 разоў. Гэта спектаклі пра нашых сучаснікаў — «Сэрца на далоні» па раману Івана Шамякіна і «Шануй бацьку свайго» В. Лаўрэнцьева.

Савецкім людзям вядомы раман маладой аўстралійскай пісьменніцы Дзімфны К'юсак. «Гарачае лета ў Берліне», у якім выкрываецца рэваншызм і мілітарызм, што пануюць сёння ў Заходняй Германіі. Спектакль, пастаўлены па гэтаму раману, мы прывезлі ў сталіцу.

Добрымі акцёрскімі работамі і цікавым мастанкім афармленнем вызначаецца «Праўда і крыўда» па п'есе лаўрэата Ленінскай прэміі М. Стэльмаха.

Гледачы Мінска і вобласці таксама ўбачаць спектаклі «Ветрык, вей!» Я. Райніса, «Часовы жылец» Ул. Палякова, «Юстына» Х. Вуойліокі.

Хочацца некалькі слоў сказаць пра нашы далейшыя планы, пра рэпертуар наступнага сезона. Зараз у тэатры рыхтуецца пастаноўка новай п'есы Аркадзя Маўзона «У доме на Сонечнай». Над кампазіцыяй пра Якуба Коласа працуюць для тэатра Максім Лужанін і Пятро Васілеўскі. Гэтай работай, прысвечанай жыццю і творчасці народнага песняра, імя якога носіць наш тэатр, мы мяркуем у лістападзе адзначыць 40-годдзе тэатра.

П'есу «Твой заўтрашні дзень» аб мужнай дзейнасці беларускіх людзей у часы вайны і міру, аб нязломных змагарах — камуністах напісаў для тэатра драматург Пятро Васілеўскі.

XXIII з'езд партыі паставіў адказныя задачы перад савецкім народам, у тым ліку і перад дзеячамі навукі і мастацтва. У савецкі час тэатр стаў сапраўды народным, сапраўды масавым. Ніколі, ні ў адну гістарычную эпоху не было такога імкнення да мастацтва, як у нас. І ў гэтым яскравае выяўленне палітыкі Камуністычнай партыі. У сваёй размове з Кларай Цэткін Ул. І. Ленін выказаў думку, што працоўныя заслугоўваюць большага, чым «цыркавыя гульні», што яны маюць права на сапраўднае вялікае мастацтва. Вось генеральная лінія савецкай культурнай рэвалюцыі. У нас ёсць добрыя традыцыі. Хочацца, каб заўтра было яшчэ лепш, чым сёння.

Думаецца, сустрэчы з мінскім гледачом многа дадуць коласаўцам, выявяць нашы дасягненні і недахопы, дапамогуць у далейшай рабоце.

Г. АСВЯЦІНСКІ,
дырэктар Тэатра імя Якуба Коласа.

ВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ

ВЕТЭРАН СТВАРЫЎ МУЗЕЙ

На прыкладзе жыцця гэтага чалавека можна вучыцца. Ён сам — жывы летапіс свайго горада і раёна. Сямён Мацвеевіч Свярдлоў працаваў першым сакратаром Рагачоўскага райкома партыі, а затым у час вайны кіраваў партызанскай барацьбой у тутэйшых мясцінах, многае зрабіў і для аднаўлення разбуранай гаспадаркі раёна.

Сямён Мацвеевіч даўно на пенсіі, але гэта не значыць, што ён пакінуў работу. Кожны дзень яго можна сустрэць у Доме культуры, у школах, на прадпрыемствах горада, у калгасах і саўгасах. Даўняй яго мараю было стварыць у Рагачове народны музей. З палымянасцю даследчыка Сямён Мацвеевіч збірае дакументы, фатаграфіі, перапісваецца, са сваімі землякамі, што жывуць у іншых гарадах, капаецца ў музеях, цікавіцца архіўнымі матэрыяламі.

У 1962 годзе па ініцыятыве Сямёна Мацвеевіча ў Рагачове быў арганізаваны краязнаўчы музей. С. Свярдлоў стаў яго грамадскім дырэктарам. У склад савета музея ўвайшлі ветераны вайны, настаўнікі, рабочыя, інжынеры. Жыхары горада і раёна горача падтрымалі цікавы папісем-успамінаў, розных дакументаў і экспанатаў. Праз Дзяржаўны музей рэвалюцыі СССР былі адшуканы фотаздымкі мясцовых камуністаў і камсамольцаў — удзельнікаў грамадзянскай вайны. Шмат фотакопій, дакументаў і здымкаў прыслалі з воінскай часці, якая вызваляла Рагачоў. Усё гэта дало магчымасць аформіць цікавыя экспазіцыі.

Шырока раскрыта ў музеі тэма «Нашы землякі ў барацьбе за ўладу Саветаў». Тут выстаўлены фотаздымкі і арыгінальныя дакументы многіх незабыўных падзей Вялікага Кастрычніка і грамадзянскай вайны, копіі газет «Искра» і «Правда». Але самай багатай з'яўляецца экспазіцыя, прысвечаная падпольнай і партызанскай барацьбе ў Рагачоўскім раёне ў час фашысцкай акупацыі.

Музей арганізаваў вялікую выстаўку ў фае Дома культуры. Тут здымкі даваеннага Рагачова — квітнеючага, прыгожага горада, здымкі руін, якія засталіся пасля фашыстаў. На выстаўцы можна бачыць копіі акта раённай камісіі па расследаванню злачынстваў, зробленых нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ад 15 снежня 1944 года. Ахвярамі фашыстаў стаілі каля шасці тысяч жыхароў раёна, сотні людзей былі вызнаны на катаргу ў Германію.

Доўга затрымліваюцца наведвальнікі перад карцінамі партызанскіх мастакоў М. Ліпеня, які працуе цяпер у Доме культуры, і С. Раманава.

Багатыя фонды музея далі магчымасць арганізаваць перасоўныя выстаўкі — «Камсамольцы дваццатых гадоў», «Нашы землякі — Героі Савецкага Саюза», «Нашы маякі» і іншыя, якія экспанаваліся ў школах і клубах раёна. У экскурсаводах недахопу няма — усюды знаходзяцца людзі, якія добра ведаюць гісторыю роднага краю.

Д. ІСАКАЎ.

РАЗМОВА ЛЯ КУБІКАЎ І БЕЛАЙ ПЛАСТМАСЫ

Віктар ГОВАР

Сёння ў майстэрнях «Мінскпраекта» вырашаецца лёс дзесяткаў новых мікрараёнаў Мінска. У новых жылых масівах будуць жыць сотні тысяч чалавек.

Можна было б сфатаграфаваць архітэктараў ля планаў і макетаў, расказаць пра тое, як яны працуюць над сваімі бясконцымі планіроўкамі, «прывязкамі», над дзесяткамі варыянтаў лепшага вырашэння дома, мікрараёна.

Але хочацца пагаварыць пра іншае. Не пра аб'ём жыллёвага будаўніцтва, не пра той «вал», які да нядаўняга часу (ды яшчэ і сёння) «вызначае» нашы поспехі. Хочацца заглянуць у душу архітэктара і даведацца: а ці задаволены ён тым, што робіць? Мабыць, і яго задавальненне вызначаецца ў канчатковым выніку, калі адкінуць усе інстанцыі, якія зацвярджаюць праекты і часам псуюць шмат крыві,—настроем жыхара, таго самага пенсіянера, які выйшаў падыхаць свежым паветрам у зеляніну, дзіцяці, якое ідзе ў школу, і гаспадыні, якая займаецца сваім хатнім клопатам.

Я АДРАЗУ прывяду канец нашай гутаркі з архітэктарам - планіроўшчыкам Аляксеем Паўлавічам Шалякіным — калі ён, трошкі аддаўшыся марам і часова пакінуўшы па-за ўвагай тыя абавязковыя планіроўкі, якія ён павінен штодзённа рабіць, сказаў такое горкае, што стала нявесела. Архітэктар падышоў да вялікага плана, што вісеў на стэндзе. Тут акуратна, пад лінейку, з захаваннем прамых вуглоў, былі прачэрчаны кварталы вуліц, і ўздоўж іх дробна, і таксама акуратна, быццам перфастужка на кінаплёнцы, прастаўлены чорныя квадрацікі дамоў.

— Гэта ж ганьба, гэта ж ганьба! Што мы рабілі! — сказаў усхвалявана архітэктар.—Як гляну я сёння на ўсё гэта — такая ганьба! І мы ў друку аб'яўлялі ўсё гэта прагрэсіўным. Ініцыятыўны метад гаркаўчан! Вельмі горкі, метад. Тут усе двухпавярховыя дамы. А што рабіць з імі сёння?

Аляксей Паўлавіч глядзеў на планы так, быццам хацеў, каб усе гэтыя дамы праваліліся скрозь зямлю, каб яны зніклі дакладна гэтак жа, як нядаўна Ліліян Лінеўская, маладая архітэктар, якая сядзіць у кутку пакоя ля акна, узяла ды і змяла ўсе дамы-калодачкі мікрараёна з чыстага аркуша паперы.

— А сёння мы будуем пяціпавярховыя дамы, — усё гэтак жа горка і сумна працягваў архітэктар. — Але хто можа сказаць, што гэта найбольш удалае вырашэнне?

Ён павярнуўся і стаў тварам да вялікага макета, што ляжаў на двух сталах.

— Вось, вы кажаце: хаатычная планіроўка, не вельмі цікавы сілуэт, пераважаюць пяціпавярховыя дамы. Вось яны: пяць, пяць, пяць!.. Пройдзе некалькі гадоў, я ўбачу гэтую планіроўку, якую стварыў сёння, і за галаву: «Божа, якая ганьба! Няўжо гэта зрабіў я?»

Архітэктар горка ўсміхнуўся і саркастычна сказаў:

— Высокія дамы... — Ён павярнуўся да планшэта, што ляжаў на стале. — Вось тут, у цэнтры мікрараёна, я хацеў бы зрабіць дом на шаснаццаць паверхаў. Але мне гавораць: рабі на дзевяць. Сёння многа праектаў дзевяціпавярховых дамоў. Можна, вядома і тут паставіць такі. Але ж праз колькі гадоў, калі будзе досыць праектаў дамоў на дванаццаць, шаснаццаць і больш паверхаў— як я паглянджу на тое, з чым сёння пагадзіўся...

Мы разглядалі мікрараён Зялёны Луг II. Тут таксама ўжыта спалучэнне пяціпавярховых і дзевяціпавярховых дамоў, як і ў Зялёным Лузе I (ён пабудаваны), і ў будучым Зялёным Лузе III, і ва ўсіх іншых мікрараёнах, што раскінуліся ад плошчы Якуба Коласа на поўнач аж да калгасных ніў. А вось на сцяне вісіць план Чыжоўкі — вялікага жылога раёна, на поўдні Мінска. Ён размесціцца, як сказаў архітэктар, у выключных прыродных умовах, побач вялікае вадасховішча. Калі ў Мінску зробяць палі фільтрацыі для ачысткі сцёкавых вод — вада ў вадасховішчы стане празрыстай, на беразе вырасце парк. З боку вадасховішча можна намаляваць цудоўную перспектыву раёна. Але калі прыгледзецца больш пільна — і тут убачыш дамы ў асноўным на дзевяць і пяць паверхаў. А калі заглянуць у іншыя майстэрні «Мінскпраекта», «Белдзяржпраекта», пазнаёміцца са шматлікімі планамі мікрараёнаў у сталіцы і іншых гарадах рэспублікі — убачыш найбольш распаўсюджанае спалучэнне: дзевяць і пяць. Рытмічнае чаргаванне дзевяці і пяці, групы дзевяці і групы пяці, аб'яднанне дзевяціпавярховых аднапавярховымі блокамі абслугоўвання, розныя развароты пяціпавярховых... Гэта ўсё роўна, што бульба з салам, бульба з маслам, бульба так і бульба з малаком. Бульба, бульба, бульба...

ПРАЎДА, нельга сцвярджаць, што ў гарадах не будуць ставіць больш высокія дамы. Некаторыя з іх будуюцца ўжо сёння. Спалучэнне пяці-, дзевяці-, дванаццаці-, шаснаццаціпавярховых дамоў у самы блізкі час пазбавіць некаторыя мясціны гарадоў той пяціпавярховай аднастайнасці, што склалася на сённяшні дзень. Але, на жаль, такія спалучэнні будуць ужыты пакуль што толькі ў асобных мікрараёнах Мінска, а ў асноўнай жа масе жылых масіваў як у сталіцы, так і ў абласных гарадах, плануецца ўсё тая ж сістэма «дзевяць і пяць», якая, як гэта ўжо добра відаць, не дазволіць стварыць нам разнастайныя і адметныя архітэктурныя ансамблі. Зразумела, можна было б нават і ў сістэме «дзевяць і пяць», разумна выкарыстаўшы колеры, своеасаблівыя кампаноўкі, розныя архітэктурныя дэталі, надаць непаўторнасць пэўным мясцінам горада, нават гораду ў цэлым, але, як гэта неаднаразова адзначалася ў друку і на нарадах архітэктараў, будаўнікі не надта ахвотна імкнуцца ствараць такую адметнасць — яна, як і ўсякае арыгінальнае вырашэнне, не садзейнічае росту «валу», патрабуе гнуткасці ў рабоце будаўнічых арганізацый.

Такія папрокі кідаюць у адрас будаўнікоў архітэктары, і яны маюць рацыю, але, відаць, мы павінны часцей гаварыць і пра іншы бок справы — больш прыгледзецца да работ архітэктараў. Ці ўсё магчымае яны робяць, каб выкарыстаць творча тое, што даюць ім сёння будаўнікі? У мікрараёне Зялёны Луг досыць зроблена розных эксперыментаў — тут ужыты і пластык, і лоджыі, і дамы на розную колькасць секцый, і колеры яркія і пастэльныя, і спалучэнні адна-, двух-, трох-, пяці- і дзевяціпавярховых дамоў, але увогуле гэты раён сёння здаецца неарганізаваным...

— Так, — прызнаўся Аляксей Паўлавіч.— мікрараён Зялёны Луг атрымаўся хаатычны.

Сёння архітэктары-планіроўшчыкі бясконца ставяць і перастаўляюць на папяровых планах белыя калодачкі, якія азначаюць дамы. Што арыгінальнае, адметнае яны «выціскаюць» з новых спалучэнняў, якія прапануюць цікавыя архітэктурныя комплексы?

Архітэктар-планіроўшчык другой майстэрні «Мінскпраекта» Анатоль Міхайлавіч Гуль знаёміць з самым цікавым сваім мікрараёнам — «Адзінаццатым» па Магілёўскай шашы. Вось далёка ад дарогі стаяць рады пяціпавярховых дамоў, бліжэй — волаты: вежавыя на шаснаццаць і даўгія дзевяціпавярховыя. Тут пройдуць дарожкі, тут будуць магазіны, майстэрні бытавога абслугоўвання, дзіцячыя пляцоўкі.

Анатоль Міхайлавіч з захапленнем расказвае пра новыя шаснаццаціпавярховыя дамы, праекты якіх ствараюць у іх майстэрні. Дамы будуць прыгожыя, са зручнай планіроўкай. Але новай кампазіцыяй незадаволены сам архітэктар, ён гаворыць даволі дакладна і рэзка:

— Глядзіце, што ў нас зноў выходзіць, — побач з даўгім і вузкім прамавугольнікам з пенапласта архітэктар ставіць слупок, што азначае вежавы дом на шаснаццаць паверхаў. — Гэта ж акурат падобна на чаргаванне пяці- і дзевяціпавярховых! Здалёк нават і не адрозніш...

Анатоль Міхайлавіч памаўчаў і дадаў няпэўна:

— Можа трэба было ўжыць даўгі пяціпавярховы і вежавы на шаснаццаць? Тут адразу б загаварыла вышыня...

Нягледзячы на тое, што ў новым мікрараёне будуць пастаўлены больш высокія дамы, там захоўваецца стары кампазіцыйны прыём, загадзя плануецца былая аднастайнасць. І тут ад-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ПРАКТЫКА ВЫМАГАЕ

Бадай, няма ў Беларусі таго кутка, дзе б ні працавалі выпускнікі нашага вучылішча. Яны, можна сказаць, асноўная сіла культурна-асветнай работы, працуюць метадыстамі, кіраўнікамі мастацкай самадзейнасці, баяністамі ў клубах і дамах культуры, выкладчыкамі ў музычных і агульнаадукацыйных школах і г. д.

Вучыцца да нас ідуць «таленты з глыбінь». У вучылішчы робіцца ўсё, каб развіваць іх творчыя здольнасці. Для гэтага выкарыстоўваюцца не толькі класныя заняткі, але і работа гурткоў. Пры вучылішчы створаны акадэмічны харавы калектыў, ансамбль народнай песні і танца, вакальныя і інструментальныя ансамблі, танцавальныя гурткі.

Узрос аўтарытэт выпускнікоў. Толькі з Магілёўскай вобласці да нас паступіла ўжо больш ста заявак на спецыялістаў. На жаль, гэтых заявак задаволіць нельга, бо вучылішча сёлета скончаць усяго 47 чалавек. Значыць, трэба намнога павялічыць выпуск спецыялістаў гэтага профілю.

У моладзі ўзрасло жаданне вучыцца ў нашым вучылішчы. У 1965 годзе было шэсць прэтэндэнтаў на адно месца. Праўда, у аснове сваёй гэта ўчарашнія васьмікласнікі. А летась мы ўкамплектавалі адну групу з вучняў, якія скончылі сярэднюю школу.

Можа, варта ператварыць вучылішча ў інстытут культуры (па тыпу настаўніцкага)? Дарэчы, да Вялікай Айчыннай вайны ў нашым будынку побач з палітасветтэхнікумам працаваў і палітасветінстытут.

Цяпер у тэатральныя інстытуты, напрыклад, на рэжысёрскі факультэт прымаюцца асобы, якія маюць стаж работы не менш двух гадоў. Мы ж выпускаем спецыяліста ў семнаццаць гадоў, без жыццёвага вопыту і вопыту работы. Для падрыхтоўкі добрых кіраўнікоў харавога мастацтва варта было б таксама набіраць моладзь з сярэдняй адукацыяй. У гэтым узросце людзі набываюць усталяваныя і ўмацаваныя галасы, з імі лягчэй займацца і па дырыжыраванню, яны смялей працуюць з хорам.

А на танцавальнае аддзяленне варта прымаць у асноўным былых васьмікласнікаў — для танца іх узрост больш прыдатны. Добра, калі б паступалі ў вучылішча людзі, якія маюць пэўны стаж работы ў самадзейнасці. Памагчы нам у гэтым могуць райкомы камсамола, аддзелы культуры, школы, дамы культуры, сельскія клубы. Ім трэба смялей рэкамендаваць у вучылішча лепшых сваіх актывістаў. А пакуль такой дапамогі мы не адчуваем. Трэба кінуць сур'ёзны дакор кіраўнікам агульнаадукацыйных школ за слабую музычна-выхаваўчую работу сярод вучняў.

Мы штогод звяртаемся з пісьмамі да кіраўнікоў эканамічна моцных калгасаў і саўгасаў з просьбай накіроўваць на вучобу лепшых самадзейных артыстаў, выплачваць ім стыпендыю. Але пакуль што ў нашым вучылішчы толькі тры калгасныя стыпендыяты. Ды і з іх засталіся толькі два, бо старшыня калгаса імя Дзяржынскага Кобрынскага раёна раптам адмовіў у стыпендыі свайму члену арцелі, якога праўленне паслала на вучобу.

Многія старшыні калгасаў просяць, каб ім прыслалі добрага спецыяліста ў клуб. З такімі просьбамі ў аддзелы культуры і ў вучылішча звярталіся праўленні калгасаў «Рассвет» Кіраўскага раёна, «Камінтэрн» і «Расія» Магілёўскага раёна, але накіроўваць сваіх калгаснікаў у вучылішча на вучобу яны не збіраюцца. Нядаўна вучылішча наведаў старшыня аднаго калгаса-мільянера з Талачынскага раёна разам з загадчыкам аддзела культуры гэтага раёна, але на пытанне, чаму яны не пасылаюць на вучобу свайго чалавека, абодва не здолелі адказаць.

Падлічана, што падрыхтоўка культасветработніка ў вучылішчы каштуе дзяржаве ў тры-чатыры разы даражэй, чым падрыхтоўка тэхніка-будаўніка. Аднак нашага выпускніка ў калгасах і саўгасах, на фабрыках і заводах, куды ён прыязджае працаваць, часта не лічаць за спецыяліста. Замест таго, каб аказаць яму дапамогу, забяспечыць жыллём, яго часам выкарыстоўваюць не па прызначэнню.

Некалькі гадоў у Доме культуры калгаса «Расія» Магілёўскага раёна працавала выпускніца Галіна Хлебнікава. Кіравала хорам, сама акампаніравала, праводзіла цікавую работу. Але невукі ад культуры называлі яе не інакш, як «Нахлебнікава», — і дзяўчына пакінула работу.

«Не зжыўся» ў працы з загадчыцаю Магілёўскага раённага аддзела культуры В. Шатухінай наш выпускнік Г. Дзямчук, які быў у яе за намесніка. І гэта таму, што ён хацеў завочна вучыцца ў педагагічным інстытуце. Шатухіна яму не дазволіла. Шкада, што нашы выпускнікі іншы раз трапляюць пад кіраўніцтва чэрствых людзей.

Ужо час сур'ёзна паставіць пытанне, каб у аддзелах культуры, клубах і дамах культуры працавалі людзі са спецыяльнай адукацыяй.

У вучылішчы ёсць і завочнае аддзяленне, на якім навучаецца прыкладна столькі ж вучняў, як і на дзённым, — звыш 400 чалавек. Аднак многія завочнікі пакідаюць вучобу. Адсеў тлумачыцца галоўным чынам цякучасцю кадраў клубных работнікаў на месцах. Кожны, хто пакінуў работу, звычайна патрабуе: «У клубе я больш не працую, вяртайце дакументы». Толькі за мінулы навучальны год вучылішча пакінулі 54 чалавекі.

Другая праблема завочнага навучання — празмерная перагрузка вучэбных планаў. На кожную сесію, якая працягваецца 30 дзён, прыпадае вялікая колькасць гадзін на тэарэтычныя і практычныя заняткі, шмат экзаменаў і залікаў. Напрыклад, на харавым аддзяленні ў чацвёртым семестры — 136 вучэбных гадзін, дзесяць экзаменаў і пяць залікаў, а гэта ўсе адмоўна адбіваецца на якасці навучання. Завочнікі ў асноўным атрымліваюць дастатковую падрыхтоўку па агульнаадукацыйных і спецыяльных тэарэтычных прадметах. Але іх вельмі цяжка навучыць валодаць баянам і фартэпіяна. З фартэпіяна, напрыклад, яны ў большасці выпадкаў сустракаюцца толькі на сесіях. Калі ўлічыць, што на завочнае аддзяленне трапляе вялікая колькасць людзей, якія не маюць ніякай музычнай падрыхтоўкі, можна ўявіць сабе іх музычныя магчымасці. Відаць, трэба дазволіць завочнікам там, дзе ёсць музычныя школы і вучылішчы, карыстацца дапамогаю выкладчыкаў і музычнымі інструментамі гэтых устаноў.

Згодна з вучэбным планам, завочнікі, якія не працуюць па спецыяльнасці, да часу іх знаходжання на апошнім курсе ўжо абавязаны працаваць па спецыяльнасці. Напрыклад, на чацвёртым курсе з 47 завочнікаў не працуюць па спецыяльнасці сем чалавек. Вельмі часта бывае, што клубам дрэнна кіруе загадчык без спецыяльнай адукацыі, і тут жа жыве завочнік-выпускнік вучылішча, а яго не бяруць на работу.

Так, напрыклад, навучэнка чацвёртага курса З. Самалюк з Кобрына колькі разоў звярталася ў раённы аддзел культуры з просьбай даць ёй работу па спецыяльнасці, аднак і па сённяшні дзень яе просьбу не прымаюць пад увагу.

У такім жа становішчы апынулася і Н. Касаткіна з Магілёва. Яна звярталася ўжо ў абласное ўпраўленне культуры і абласны Дом народнай творчасці. Работы па спецыяльнасці ёй не далі.

Уладкаванне завочнікаў на работу, іх выкарыстанне па спецыяльнасці — праблема, якую вырашыць няцяжка. І чым хутчэй яна будзе вырашана, тым больш выйграюць сельскія клубы і дамы культуры, бо ў іх будуць працаваць кваліфікаваныя спецыялісты, людзі, якія любяць клубную работу.

Наша вучылішча яшчэ нездавальняюча забяспечваецца метадычнай і вучэбнай літаратурай па спецыяльных прадметах.

У 1964 годзе быў зацверджан новы вучэбны план з трохгадовым навучаннем па дзённаму аддзяленню, але толькі ў гэтым месяцы нам прыслалі аналагічны вучэбны план па завочнаму аддзяленню. Міністэрству культуры РСФСР, якое складае для нас вучэбныя планы, праграмы, спатрэбілася аж два гады на складанне плана для завочнікаў. Няма зацверджаных праграм па раду прадметаў. Па некаторых тэатральных дысцыплінах мы карыстаемся праектам праграм 1960 года, якія, вядома, устарэлі.

Няма канкрэтнай праграмы па баяну. Па баяну і фартэпіяна нам недастаткова высылаюць метадычных распрацовак.

Вырашэнне ўсіх гэтых праблем дасць магчымасць значна палепшыць падрыхтоўку і выкарыстанне спецыялістаў клубнай работы, якія цяпер так неабходны вёсцы для далейшага ўздыму яе культуры.

М. УСІКАЎ,
дырэктар Магілёўскага культурна-асветнага вучылішча імя Н. К. Крупскай.

Старшы выкладчык Віцебскага педагагічнага Інстытута імя Кірава Д. Генеральніцкі да 50-годдзя Савецкай улады стварае серыю скульптур герояў Вялікай Айчыннай вайны і мірнай працы Віцебшчыны. Цяпер скульптар-энтузіяст заканчвае работу над вобразам Героя Савецкага Саюза Аляксандра Свядзінскага, які загінуў у гады фашысцкага нашэсця на нашу Радзіму.

Фота Г. УСЛАМАВА. (БЕЛТА).

ЯНКА КУПАЛА ГАВОРЫЦЬ ПА-ЭСТОНСКУ

Імя народнага паэта Беларусі Янкі Купалы стала вядома шырокаму эстонскаму чытачу пасля 1940 года — года аднаўлення савецкай улады ў Эстоніі. З таго часу яго вершы ўсё часцей і часцей перакладаюцца на эстонскую мову, друкуюцца на старонках эстонскіх перыядычных выданняў.

Нядаўна выдавецтва «Ээсці раамат» выпусціла першы зборнік вершаў Я. Купалы ў перакладзе на эстонскую мову. Называецца зборнік «А зязюля нукавала». У яго ўключаны 33 вершы. Іх пераклалі з беларускай мовы па зборніку Я. Купалы «Выбраныя творы» (Мінск, 1947) вядомыя эстонскія паэтэсы Муйя Вээтам і Хельві Юрысон. Аформіў кнігу мастак С. Лійберс.

О. КІВІ.

г. Талін.

РАЗМОВА ЛЯ КУБІКАЎ З БЕЛАЙ ПЛАСТМАСЫ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

разу відаць, што прыгажосць «касцюма» залежыць не толькі ад высокай якасці матэрыялу, але і ад умельства «краўца», яго пэўнай філасофіі, згодна з якой ён працуе. А ў дадзеным выпадку, мне здаецца, нам асабліва шкодзяць старыя ўяўленні «краўца». Асабліва адно, якое можна ахарактарызаваць, як жаданне падаць усё ў найлепшым ракурсе, як любоў да парадкасці (архітэктары ў дадзеным выпадку ўжываюць тэрмін «трымаць вуліцу»). У тым жа «Адзінаццатым», пра які расказваў Анатоль Міхайлавіч, апрача дзевяці- і шаснаццаціпавярховых дамоў ёсць і пяціпавярховыя. Але з магістралі ў будучым вы іх не ўбачыце, яны будуць старанна схаваны за плечы гігантаў. Ствараецца спецыяльны пласкасны малюнак на гледача з магістралі. Архітэктурная кампазіцыя хоча ўразіць, здзівіць веліччу, маштабнасцю. Але ўжо сёння, знаёмячыся з планам, пачынаеш дзівіцца іншаму. Проста пад вокнамі дамоў грукоча, узнімае пыл, дыхае асфальтам і бензінавым перагарам магутная Магілёўская шаша. Не ўратуе і адведзеная згодна з нормамі 50-метровае адступленне ад праезджай часткі. Архітэктары прапануюць зрабіць зялёную заслону з дарослых дрэў, але і зараз яны сумняваюцца: будаўнікі, як звычайна, уторкнуць перад дамамі «рублёвыя» нітачкі-дрэўцы і паставяць «птушку» — азеляненне праведзена. А жыхарам цэлых паўвека давядзецца слухаць грукат, дыхаць пылам, чакаючы, пакуль вырасце зялёная зона. Сёння многія архітэктары ў такіх выпадках шукаюць іншае рашэнне, паварочваюць часам дамы да буйных магістраляў тарцамі, прытым глухімі. І ў гэтым ёсць свая эстэтыка, яна вынікае не толькі з функцыянальнай мэтазгоднасці. Вялікія чыстыя плоскасці тарцоў могуць несці дэкаратыўны малюнак, могуць удала спалучацца з аднапавярховымі шклянымі прыбудовамі, ствараць пэўны рытм. Але мы чамусьці не распрацоўваем, нават блізка не падыходзім да новай мэтазгоднай эстэтыкі, мы саромеемся тарцоў, нам здаецца, што гэта няветліва, быццам паказаць госцю спіну. А да таго ж давядзецца раскрыць унутрыквартальную прастору. «Які сорам, які жах!» У Гомелі пяціпавярховай «сценачкай» у Фестывальным мікраёне прыкрылі аднапавярховыя дамы. У Віцебску пяціпавярховымі дамамі па вуліцы Фрунзе таксама засланілі больш нізкую забудову. Праедзьце па мінскіх вуліцах, на якія выходзяць новыя мікраёны, — амаль усюды, як і ў ранейшых вуліцах-калідорах, дамы цягнуцца ўздоўж дарог, старанна хаваючы ўнутрыквартальную прастору. Архітэктары, магчыма, будуць і пярэчыць: «не, гэта не зусім радковая забудова, што была да 1954 года. Паміж дамамі зроблены разрывы». Але жаданне архітэктараў у многіх комплексах чытаецца выразна — яны свядома не пускаюць вока чалавека, які едзе па магістралі, далей чырвонай лініі, яны быццам саромеюцца паказаць тое жыццё, што ідзе ў мікраёнах у двух-, трох- і пяціпавярховых дамах, імкнуцца стварыць парадны «фасад», як было даўней, калі ўладарыў архітэктурны неарым і ампір. Нашы многія новыя вуліцы, дамы на якіх разгорнуты строга ў лінію, выглядаюць на дзіва сумна і аднастайна, і не надаюць ім жывапіснасці там-сям уторкнутыя высокія дамы.

Даводзіцца з вялікім жалем канстатаваць, што мы яшчэ не авалодалі асноўнымі кампазіцыйнымі прыёмамі новай архітэктуры, не навучыліся «кіраваць» архітэктурнай прасторай, мадэліраваць яе так, каб выявіць яе розныя адметныя якасці, пераход з аднаго асяроддзя ў другое, багацце перспектыўных змен. Такое часам у нас выходзіць выпадкова, няпланава. Мікраён Зялёны Луг імкнуліся эфектна раскрыць на магістралі, і з гэтага нічога добрага не атрымалася — звычайныя «сценачкі». Але вось унутры мікраёна ёсць цікавыя перспектывы, якія ўзніклі «стыхійна» — прыгожае спалучэнне рознакаляровых дамоў, размешчаных па прыроднаму рэльефу. Такія нечаканыя прыгожыя спалучэнні атрымаліся ў некаторых іншых мікраёнах. А чаму б іменна такую кампазіцыю не раскрыць на магістралі? Але сёння архітэктары не заўсёды гэта плануюць. А шкада. Мы абкрадаем саміх сябе, мы, імкнучыся «трымаць вуліцу», знарок плануем аднастайнасць, займаемся пакуль што, вобразна кажучы, толькі пласкасным, фасадным праектаваннем, у якім ужываем не больш дзвюх-трох розных нот.

Архітэктар Гуль апраўдваецца — ён скардзіцца на адсутнасць часу. Праекты мікраёнаў трэба здаваць адзін за адным, няма калі падумаць. І гэта слушна. Творчая работа нашага архітэктара часам ператвараецца, як іншы раз злосна жартуюць, у «перастаўленне двух-трох розных кубікаў», няма часу паэксперыментаваць, разгледзець розныя варыянты забудовы. Гэта таксама адна з прычын аднастайнасці. «Эканомія на запалках» — на праектаванні — не лепшае выйсце для таго, каб будаваць і танна і прыгожа.

Аднак, знаёмячыся з нашымі мікраёнамі, часам прыходзіш да горкай думкі: можа, зрэшты, архітэктары і маюць рацыю? Можа сапраўды мікраёны нам яшчэ не варта паказваць «знутры»? Бо каб часам зайсці ў які мікраён ды ўбачыць яго «інтымнае» жыццё, па-першае, трэба, падрыхтаваць добрыя боты, лепш за ўсё паляўнічыя...

Анатолю Міхайлавічу Гулю не да жартаў — гэтая «гразевая» праблема сядзіць, можна сказаць, у яго вантробах. Ён выцягвае паперы. Копіі пісем ва ўпраўленні капітальнага будаўніцтва і будаўніцтва і архітэктуры Мінскага гарвыканкома. Яны складзены пасля абследавання мікраёнаў, якія праектавала другая майстэрня. У іх, у прыватнасці, гаворыцца пра жылыя масівы па Ракаўскай шашы і вуліцы Апанскага. Адно пісьмо адаслана летась, апошняе — нядаўна. Тыя, хто павінен адказваць, — маўчаць... Аўтары пісем з болем у сэрцы разглядаюць «гразевую» праблему і прапануюць рэальнае выйсце.

Здараецца вось што. Новыя мікраёны наш асноўны заказчык, Упраўленне капітальнага будаўніцтва, пачынае рабіць, мякка кажучы, крыху дзіўна, і зусім не так, як гэта рэкамендавана разумнымі тэорыямі будаўніцтва мікраёна: пракладзі спачатку дарогі і розныя інжынерныя падземныя камунікацыі, а потым стаў у адным з куткоў будучага мікраёна дамы, добраўпарадкоўвай плошчу і перабірайся на наступны кавалак. І там, дзе стаяць дамы, будзе і зеляніна, і чыстыя тратуары, і выгода для дзяцей. Але гэта адхілілі. Дамы па ўсёй плошчы мікраёна ставяць выбарачна. Сёння кладуць дарогу, разбіваюць газоны, а заўтра ўсё перакопваюць, бо трэба падвесці ваду і каналізацыю для таго дома, што «забылі» паставіць у групе дамоў. Ды добра было б, каб толькі перакапалі дарогу ці газон. Пачынаюць ездзіць велізарныя машыны будаўнікоў, нацягваючы на дарожкі па калена гразі, ламаючы дрэвы і дзіцячыя пясочніцы. Але, нарэшце, канчаюць дом, раве бульдозер, усё раўнуючы. Нанава кладуць дарожкі, прывозяць чарназём. І гэта толькі на час, бо там, сярод новых дамоў, пакінута месца яшчэ на адзін...

Зразумела, работнікі Упраўлення капітальнага будаўніцтва кіруюцца пэўнымі меркаваннямі, найчасцей эканамічнымі: «Тут бліжэй камунікацыі — паставім дамы. А дом з магазінам пачакае, квадратны метр жылой плошчы каштуе ў ім даражэй, і пачакаюць вежавыя цагляныя — яны таксама больш дарагія. Дамы ставіць тут і тут...» Але ў канчатковым выніку такая «палітыка» абыходзіцца значна даражэй за тую, якая прапануе будаваць у строгай паслядоўнасці. А для жыхароў яна прыносіць шматлікія нязручнасці. Нездарма ж некаторыя кватэры ў мікраёнах пустуюць па паўгода — людзі адмаўляюцца ад ордэраў, лічаць за лепшае жыць па пяць чалавек у прыватным пакоі, але ў добраўпарадкаваным квартале. Навошта ехаць туды, дзе няма школ, магазінаў, дзіцячых садоў, майстэрань бытавога рамонту, дзе непралазная гразь? Тое, што павінна было стаць самым зручным для жыцця чалавека, мы штучна робім самым нязручным!

Але нават і тады, калі заканчваецца будаўнічы перыяд, у нашых мікраёнах не ўсё добра. У іх не ствараюцца, як гэта ні сумна, усе тыя выгоды, пра якія з захапленнем пішуць газеты і часопісы вось ужо гадоў дзесяць. Добраўпарадкаванне будаўнікі часам адхіляюць «у прынцыпе». Не садзяць дрэў, не ставяць альтанак, пергал, падпорных сценак, не робяць басейнаў для дзяцей — словам, не выконваюць усяго таго, што прадугледжвалася архітэктарам. Сродкі на гэта адпускаюцца, але кожны год не выкарыстоўваюцца. Аднак патрабаваць ад будаўнікоў, каб яны ўсё гэта зрабілі, ні архітэктары, ні Упраўленне капітальнага будаўніцтва, ні нават жыхары чамусьці не хочуць — маўляў, не да раскошы! Трэба спачатку, разважаюць яны, вырашыць **асноўныя** пытанні.

Паглядзіце, як жыве наш «мікраённы чалавек». Калі яго раён недабудаваны, ён купляе ўсе прадукты, розныя тавары, вязе ўсё на рамонт у горад — дамы з абслугоўваннем звычайна ставяцца ў апошнюю чаргу. Так здарылася ў мінскіх мікраёнах Зялёны Луг, па Ракаўскай шашы, у «Адзінаццатым» па Магілёўскай, і мікраёнах Магілёва, Гомеля і іншых гарадоў. Але дапусцім, што будаўніцтва мікраёна ў асноўным закончана. 20-40 мінут аўтобуснай штурханіны, і людзі выходзяць «у родным куце». І тут пачынаецца... Трэба аббегаць магазіны. Калі вы чыталі пра ідэальны тэарэтычны мікраён, то там было адзначана, што ўсё гэта робіцца зараз — у адным месцы і прадуктовы, і прамтаварны, і розныя майстэрні, і аптэка, і клініка. Выгода! Але на практыцы такога няма. Сёння «мікраённы чалавек» павінен мець дужыя ногі, бо «абслугоўванне» раскідана па ўсіх украінах мікраёна. Каб не быць галаслоўным, можна нагадаць мікраёны па Харкаўскай вуліцы, Зялёны Луг і іншыя. Чалавек так набегаецца — кіламетры два — тры ўзапар, ды яшчэ настаіцца ў чарзе, што тут не да пергал ды басейнаў для дзяцей. Хто вінаваты ў гэтым?

Архітэктар А. Гуль разводзіць рукамі:

— Міжведамасныя бар'еры...

Архітэктар малюе тут самую «выгоду», што значыцца ў тэарэтычным мікраёне, — грамадска-гандлёвы цэнтр. А потым закрэслівае, яго.

— Гэта павінна будаваць аптэкаўпраўленне. Гэта — кінапракат. Гэта — Упраўленне гандлю. Гэта...

«Пад адзін дах» трэба сабраць сродкі многіх устаноў. Але на такое ніхто не хоча ісці. Кожны прывык быць «гаспадаром». І вось архітэктары вымушаны ставіць дамы з убудаванымі ў іх магазінамі, ды чамусьці раскідваюць іх па ўсёй украіне, мабыць, зыходзячы ўсё ж з таго сарамяжлівага пачуцця парадкасці, якое сціпла называецца «трымаць вуліцу». Архітэктары нядаўна былі ўзрадаваліся, думаючы, што нарэшце справа зрушылася з месца, і ў Зялёным Лузе сёлета будзе пастаўлены першы ў Беларусі грамадска-гандлёвы цэнтр. Быў зроблены нават праект. Але нядаўна стала вядома, што Упраўленне капітальнага будаўніцтва выкрасліла з плана цэнтр — відаць, па кавалках, як і паказваў архітэктар Гуль...

Сапраўды, жыхарам мікраёнаў сёння не да раскошы. І дзе ім ужо гаварыць пра такую дробязь, як пешаходная дарожка. (Маюцца на ўвазе закончаныя мікраёны). Вясною і ўвосень людзі звычайна абуваюць боты і ідуць па гразі ў магазін, дзіцячы сад, да аўтобуса. А паводле задумы, павінны існаваць спецыяльныя дарожкі для пешаходаў, з цвёрдым пакрыццём.

— Мы ўсімі сіламі імкнёмся гэта ўлічыць, — гаворыць архітэктар Аляксей Паўлавіч Шалякін. — Але мы не хочам класці асфальт (тлумачыць гэта не трэба, усе жыхары мікраёнаў супраць асфальту), мы просім бетонныя пліты. А іх нам не даюць...

З гэтымі бетоннымі плітамі, якімі пажадана выкладваць пешаходныя дарожкі, — цэлая гісторыя. Маецца на ўвазе звычайная, мінімум 50 на 50 сантыметраў, бетонная тонкая пліта, якая, як падлічылі эканамісты, больш танная, чым асфальт, гігіенічная, прыгожая. Пра яе заўсёды гавораць як пра нейкую недасягальную мару шмат гадоў запар. Гавораць нават, што яе пачалі недзе ў Мінску вырабляць. Але ніхто яе яшчэ не бачыў, да будаўнікоў яна не даходзіць. І чаму б не наладзіць вытворчасць бетонных пліт як найшырэй? Гэта пад сілу Міністэрству будаўніцтва БССР.

І дзе ўжо яму, жыхару мікраёна, турбавацца пра тое, каб было рэалізавана яшчэ адно цудоўнае тэарэтычнае палажэнне, абвешчанае архітэктарамі на зары будаўніцтва мікраёна.

— Мы іх, — архітэктар Шалякін паказаў на планы невялічкіх прыбудоў да пяціпавярховых дамоў, — пабудавалі, але больш не будзем! — Ён гаварыў з гаркатой, але цвёрда.

І сапраўды, ні ў адным з новых праектаў не было гэтых маленькіх прыбудовак, якія ўжо можна ўбачыць у Зялёным Лузе. Гэта невялічкія ўтульныя дамочкі, у кожным з іх некалькі пакояў. Паводле задумы, яны павінны абслугоўваць групу дамоў — тут павінны быць дзіцячы пакой, чытальная зала, зала для сходаў, пакой для аматараў сталярнай і слясарнай справы. Карацей кажучы, гэта павінны быць своеасаблівыя клубы. І самі архітэктары ад іх і адмаўляюцца!

— Адзін дамок заняло домакіраўніцтва, другі — адышоў пад майстэрні бытавога рамонту, у трэцім — будуць аптэка і яшчэ нейкія ўстановы... Чаму? Дык трэба ж недзе і гэтыя ўстановы размясціць, для іх жа нічога не пабудавана...

— Але хоць эксперыментальна вы будзеце правяраць жыццёвасць задумы?

— Пастараемся, — уздыхае архітэктар. Але мне чуецца ў яго голасе безнадзейнасць.

А што ў нас выходзіць з дзіцячымі садамі? Сёння ў мікраёнах іх будуюць дастаткова. Але ўладкаваць дзіця ў сад жыхару мікраёна цяжка — гарвыканком размяркоўвае месцы «валам», па ўсім горадзе. Усе пад'езды дзіцячых садоў мінскіх мікраёнаў заклеены аб'явамі: «Мяняю дзіцячы сад у Зялёным Лузе на дзіцячы сад на Арлоўскай». «Мяняю дзіцячы сад на Арлоўскай на дзіцячы сад у Зялёным Лузе». Калі ж тут будзе наведзены парадак?

А тупіковыя праезды?

У Зялёным Лузе, напрыклад, як і ў некаторых іншых мікраёнах, дыскрэдытуецца яшчэ адна цудоўная ўмова мікраённага жыцця. Асфальтавыя дарожкі, па задуме, павінны падыходзіць да дамоў і тут канчацца тупікамі. Далей ехаць нельга. Гэта гарантыя таго, што дзіця, ідучы ў школу, сад, гуляючы на двары, нідзе не будзе перасякаць аўтамабільнай дарогі. Але сёння па нашых мікраёнах аўтамабілі і матацыклы імчацца ва ўсіх напрамках на вялікіх хуткасцях, і вадзіцелі нават злуюцца, што ім перашкаджаюць ездзіць пешаходы. У мікраёнах, якія створаны выключна для пешахода, — пешаход баіцца аўтамабіляў!

Архітэктары і з гэтым нічога не могуць зрабіць. У праектах адзначаны тупікі, але на іх ніхто не звяртае ўвагі. Не ставіць жа паркаў! І архітэктары гавораць:

— І пра гэта напішыце!

Напісаць — значыць звярнуцца да грамадскасці, да жыхароў, домакіраўніцтваў. Урэшце-рэшт з'явяцца паркаў... Але, магчыма, ёсць іншае выйсце, больш эстэтычнае, над якім падумаюць архітэктары?

Мы навучыліся праектаваць дамы. З кожным годам нашы дамы становяцца ўсё больш прыгожымі. Відаць, наспеў час навучыцца кампанаваць гэтыя новыя сучасныя дамы ў новых прыгожых архітэктурных ансамблях. Відаць, самую сур'ёзную ўвагу трэба ўдзяліць арганізацыі забудовы нашых новых мікраёнаў і дабіцца, нарэшце, добраўпарадкавання і стварэння ўсіх тых выгод, што былі дакляраваны выдатнымі і прагрэсіўнымі тэорыямі сучаснага горадабудавання.



У памяшканні Мінскага акруговага Дома афіцэраў пачаў свае гастролі Растоўскі дзяржаўны драматычны тэатр імя Максіма Горкага. У першы дзень гастроляў калектыў паказаў спектакль «Цыган» па матывах аднайменнай аповесці А. Калініна. Інсцэніроўка і пастаноўка заслужанага артыста РСФСР і ТАССР М. Праваторава, мастак М. Фатаў, музыка Д. Івашчанкі.

На здымку — сцэна са спектакля. У ролі Цімафея Ільіча — М. Капітохін, Будулая — М. Праваторaў, бухгалтара — Д. Усцінаў.

Фота Ул. КРУКА.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ, ЯРКАЕ, СУЧАСНАЕ

Самарканд, Бухара, Рэгістан, Фархад і Шырын — каму не вядомы гэтыя старажытныя назвы і імёны сонечнага Узбекістана! І ў той жа час узбекскае мастацтва маладое. Станковы жывапіс, графіка і скульптура з'явіліся ва Узбекістане пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Раней рэлігія забараняла адлюстроўваць чалавека і адухоўлены свет прыроды. Дарэвалюцыйнае мастацтва было абмежавана формамі дэкаратыўнай і прыкладной арнаментальнай творчасці. На першых этапах станаўлення новага віду мастацтва Узбекістан, як і іншыя рэспублікі Сярэдняй Азіі, не мог вылучыць нацыянальных жывапісцаў, графікаў, скульптараў. Авалоданне новымі формамі з'явілася доўгім па часе і складаным працэсам. У першыя гады Савецкай улады ва Узбекістане працавалі рускія мастакі, яны памагалі фарміраванню нацыянальных мастакоў.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны мастацтва Узбекістана ўступіла ў новы этап свайго развіцця. Мастакі Узбекістана стварылі нямала значных твораў, якія атрымалі народнае прызнанне. Творы іх дэманстраваліся на рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных выстаўках.

Нядаўна ў залах Дзяржаўнага мастацкага музея БССР адкрылася выстаўка выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва таленавітага ўзбекскага народа, дзе прадстаўлены жывапіс, скульптура, графіка, разбярства, кераміка.

Разнастайная тэматыка жывапісных твораў. Тут партрэты лепшых людзей рэспублікі, пейзажы пераўтворанай узбекскай зямлі. Сімвалічная карціна Б. Бабаева «Дарога ў пустыні». Вяблюд стаіць ля толькі што пабудаванай чыгункі, якая адыходзіць у перспектыву. Чыгунка як бы ўвасабляе тое новае, што ўвайшло ў жыццё рэспублікі.

Разнастайная партрэтная галерэя. Мы бачым жыццярадаснага і энергічнага старога калгасніка Зулін-Бува на партрэце работы В. Фадзеева. Цікавы па кампазіцыі і жывапісе «Партрэт паэтэсы Зульфіі» работы Ч. Ахмарава. Тонкі сілуэт, стрыманыя жывапісныя тоны памаглі мастаку стварыць вобраз, поўны душэўнай прывабнасці, паэтычнасці і жаноцкасці. Засяроджаным і працавітым устае перад намі славуты майстар узбекскай керамікі У. Джуранкулаў у рабоце мастака Г. Улько.

Заслужаны дзеяч мастацтваў Узбекскай ССР П. Бянькоў у карціне «Дзяўчына з дутаром» цудоўна ўлавіў тыя рысы, якія ўласцівы сучаснай узбекскай моладзі. Твар дзяўчыны адухоўлены, у яе задуменным позірку відаць думка, валявое напружанне. Палатно напісана энергічнымі, тэмпераментнымі мазкамі, адчуваеш маляўнічае багацце свету.

Пейзажы ўзбекскіх мастакоў перадаюць прыгажосць велічных горных вяршынь, пакрытых вечным снегам, шырокіх рачных далін, помнікаў старажытнай архітэктуры. Трэба ў першую чаргу назваць народнага мастака рэспублікі У. Тансыкбаева. З вялікім захапленнем ён піша калгасныя палі, квітнеючыя сады, перадгор'і, даліны Аму-Дар'і і Сыр-Дар'і. Яго карціна «Сыр-Дар'я» — песня пра магутную раку. Спалучаючы асветленыя сонцам раку і далі з трошкі зацемненым пярэднім планам, мастак стварае адчуванне ранішняй свежасці.

Пейзаж Н. Карахана поўны паветра. Тут выразная кампазіцыя. Мастака вабіць каляровая гармонія (палотны «Залатая восень», «Возера Сары-Чэлен»).

Чароўныя ў карцінах славутыя па архітэктуры будынкі. Вось «Дворык у Шах-і-Зіндзе» Ю. Елізарава, «Хівінскія вароты» М. Мангазіна. Графічны ліст М. Шчыроўскага «Самарканд. Бібі Ханум» дакладны і канкрэтны ў перадачы дэталяў.

Некаторыя графічныя творы расказваюць пра сённяшні Узбекістан, пра пафас стваральнай працы, пра перамогу чалавека над стыхіяй. Тут «Зямля атакуецца» А. Цыглінцава, «Па дарогах Радзімы» А. Назырава, «Тут будзе Чарвакская ГЭС» К. Чапракова.

Са скульптурных твораў хочацца назваць «Будаўніка» Р. Немироўскага. Энергічная лепка, гульня светаценяў памагаюць выявіць характар валявога і мэтанакіраванага чалавека. Цікавая работа В. Шастапала «Гімнастка». Тут пластычна перададзена пругкае натрэніраванае цела.

На выстаўцы вялікі аддзел дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Узбекскія майстры ў гэтым жанры стварылі выдатныя творы, якія здзіўляюць прыгажосцю лініі, смеласцю фантазіі. Тут і мастацкі тэкстыль, і вышыванне, і залатое шыццё, і вырабы з металу, разьба па дрэву і г. д.

Большая частка вырабаў з дрэва выканана ў традыцыйнай манеры разьбы, што выкарыстоўваецца для ўпрыгожання мэблі і розных рэчаў быту. Апрача работ плоскарэльефнай разьбы, па выстаўцы выстаўлены «рашотчатыя» вырабы. Звяртае ўвагу ажурная цырма, выкананая ў тэхніцы «панжару» майстрам М. Касымавым.

Вабяць распісныя вырабы з дрэва — дэкаратыўныя столікі, шкатулкі, мэбля. Яны ўпрыгожаны ўзорамі расліннага і геаметрычнага характару («Столік» работы Р. Мірагзамава, «Дзіцячы гарнітур» майстра Д. Хакімава). Керамічныя блюды, міскі, талеркі і іншы посуд распісаны стылізаванымі ўзорамі ў выглядзе кветак, пладоў, гронак вінаграду і інш. Тут працуе рад вядомых майстроў-кераміст аў — А. Амімаў, К. Хазраткулаў, Н. Нарзулаеў, А. Каюмаў і іншыя.

Прыгожая чаканка па медзі майстра Х. Саідава на збане старадаўняй формы. Вабіць мастацкае залатое шыццё майстроў — халаты, цюбецейкі. Багатыя па расфарбоўцы ўзбекскія дываны.

Мастацтва Узбекістана нацыянальнае, своеасаблівае, сучаснае, бо яно арганічна звязана з жыццём народа.

Р. БАДЗІН.

АКЦЁР, КІНО І СУЧАСНАСЦЬ

Праблемы, звязаныя з роллю і месцам акцёра ў сучаснай кінавытворчасці, са стылявымі асаблівасцямі акцёрскай ігры ў фільмах апошняга часу, ажыўлена абмяркоўваюцца ў асяроддзі савецкіх кінематаграфістаў.

Карэспандэнт АДН звярнуўся да вядомых дзеячоў савецкага кіно — рэжысёра Марлена Хуцыева і акцёра Міхаіла Ульянава з просьбай расказаць, што яны лічаць найбольш характэрным і важным для сённяшняй выканаўчай манеры, якія адзнакі сучаснага стылю акцёрскай ігры.

САТВОРЧАСЦЬ І ІМПРАВІЗАЦЫЯ

Марлен ХУЦЫЕЎ,
кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР

Стыль не ўзнікае сам па сабе, з нічога, або толькі па загадзе моды. Яго вытокі часцей за ўсё ляжаць у паводзінах чалавека: стыль залежыць ад яго манеры паводзіць сябе, гаварыць, ад дынамікі мовы, ад усяго комплексу сучасных акаляючых умоў. Бясспрэчны таксама і ўплыў узаемасувязей людзей нашай планеты, якія ўсё ўзмацняюцца, павелічэнне маштабаў іх кантактаў, скарачэнне адлегласцей паміж краінамі і кантынентамі...

Усе гэтыя і многія іншыя асаблівасці існавання сучаснага чалавека і вызначаюць у той ці іншай меры стыль акцёрскай ігры ў другой палавіне дваццатага стагоддзя.

Адна з ярка выражаных тэндэнцый у акцёрскай рабоце — гэта натуральнасць, знікненне дэкламацыйнасці, рыторыкі. Акцёры іграюць у разліку на гледача, якому не трэба ўдзёўбваць элементарныя, лабавыя панящці, на гледача, які прывык да самастойнага асэнсавання ўбачанага на экране, дзе акцёры (больш правільна — іх героі) проста звязаны паміж сабою, уступаюць у тыя або іншыя жыццёвыя ўзаемаадносіны. Мы ведаем, што тэатр заўсёды меў уплыў на кінематограф, асабліва па лініі акцёрскай, але цяпер многае мяняецца і ў тэатры — гэта тое, што кібернетыкі называюць «адваротнай сувяззю».

Але ў гэтым «новым» стылі, як мне здаецца, ёсць і свае мінусы і небяспекі. Знайшоўшы вонкава жыццепадобную манеру, акцёры часам прыкрываюць яе гэтакай лёгкасцю, замяняюць прыемнай неахайнасцю сапраўдную глыбіню, дынаміку думкі. Лёгкасць зносін можа нівеліраваць складанасць характараў. А сама манера абясцэньваецца відавочнай даступнасцю для ўсіх — таленавітых і бяздарных. І тады затушоўваецца самае каштоўнае, самае станоўчае, што нясе ў сабе новы стыль, — яго здольнасць адлюстраваць імклівы палёт думкі сучаснага чалавека.

Усялякае прывядзенне да агульнага назоўніка несправядлівае. Могуць і павінны існаваць розныя стылі. Сама манера выканання ў першую чаргу залежыць ад паглыблення зместу рэчы, якая выконваецца. Ад акцёра-выканаўцы патрабуецца перш за ўсё глыбіня, прысутнасць яго асобы, пазіцыі, уменне бачыць свой час, сваю эпоху, разумець яе і быць яе актыўным удзельнікам.

Што датычыць фармальных адзнак новага стылю, дык мне асабіста здаецца найбольш плённым і цікавым метад імправізацыі.

Калі ў тэатры ўсе кампаненты спектакля замацоўваюцца рэпетыцыямі, а потым ужо ўзнікае адчуванне ўнутранай свабоды для акцёра, дык у кіно акцёр часта з прычыны самой спецыфікі нашай вытворчасці траціць нярэдка адчуванне нараджэння факта мастацтва. Таму я люблю ў час здымкаў уцягваць акцёра ў сатворчасць, даваць яму магчымасць імправізаваць унутры зададзенай тэмы і нават мяняць нейкія прыватнасці і дэталі ў дыялогу. Гэта дае яму неабходную ўпэўненасць больш поўна ўваходзіць ва ўнутраны свет свайго героя.

Я — ЗА АКЦЁРА-МЫСЛІЦЕЛЯ

Міхаіл УЛЬЯНАЎ,
народны артыст РСФСР, лаўрэат Ленінскай прэміі

Манеру ігры таго ці іншага сучаснага акцёра, вядома, вызначае цэлы рад адзнак. Перш за ўсё гэта — унутраная напоўненасць, стрыманасць у эмоцыях. Акцёр імкнецца адлюстраваць сённяшняга мыслячага чалавека, якому свет задае шмат загадак.

Я шмат чытаў пра вялікага Мачалава. Ён іграў так, што ў востра-трагедыйных эпізодах зала ў жаху ўставала. Можа, цяпер проста няма такіх акцёраў? Але праўдзівей тое, што людзей сёння не вельмі спалохаеш — яны занадта многа пабачылі жахаў, якія пераўзыходзілі ўсё, прыдуманае фантазіяй драматурга. Гледачы прыходзяць у кіно і тэатр са сваімі роздумамі, пытаннямі, на многія з якіх чакаюць адказу ад мастацтва.

Невыпадковае прызнанне гледачом ігры Смактуноўскага ў «Гамлеце». Яна вызначаецца сучаснай трактоўкай вялікага вобраза. Акцёр іграе Гамлета не юнаком, які прыходзіць у жах і замяшанне ад недасканаласці свету, а сталым чалавекам, які ведае жыццё і шукае выйсця, шляхоў да перамогі над гэтай недасканаласцю. І ў гэтым ён пераклікаецца з сучасным чалавекам, які ведае, што над ім вісіць страшная пагроза знішчальнай атамнай вайны, але ён думае, шукае шляхі да далейшага жыцця, да яго перамогі над сіламі рэакцыі.

Не магу не сказаць пра тое, што ў нас стала моднай гэтакая ігра «падсябе», мармытанне тэксту, шэпт, што павінна перадаваць вонкавае падабенства жыцця. У многім гэта ідзе ад драматургіі. Шчыра кажучы, тут няма вялікіх цяжкасцей, і многія акцёры гэта ўмеюць рабіць віртуозна. Але пры гэтым акцёр адвыкае ад сапраўднага напалу, поўнай аддачы сябе, — а ў нашай жа прафесіі неабходна пастаянная трэніроўка.

Я лічу вялікай школай для сябе выканання ролі Рагожына ў «Ідыёце» Дастаеўскага, якая патрабуе ад акцёра сапраўды высокіх пачуццяў, поўнай самаддачы. Працуючы над вобразам Ягора Трубнікава ў фільме «Старшыня», я зразумеў, што тэмперамент, сапраўднае адкрыццё характару — гэтыя панящці не мяняюцца ад эпохі да эпохі, яны неабходныя ў акцёрскім мастацтве заўсёды. Паглядзіце, якая шчодрая Сафі Ларэн у «Шлюбе па-італьянску». Яна не шэпча, не баіцца вялікіх пачуццяў, рэзкіх штрыхоў, яркіх фарбаў. Так ігралі і дзесяцігоддзі назад вялікія, сапраўдныя акцёры.

Але, вядома, я зусім не хачу сказаць, што нічога не змянілася. Галоўнае, чым адрозніваецца сённяшні стыль, — гэта тое, што ў акцёрскую задачу ўвайшлы роздум аб лёсе свету, грамадства. Акцёрскае майстэрства развіваецца разам з развіццём чалавечай свядомасці. Яно ўзбагачаецца ўсё больш тонкімі сродкамі раскрыцця індывідуальнасці героя ў яго непаўторнасці, яно больш пільна ўглядаецца ў тыя бакі быцця, якія раней не ўваходзілі ў сферу яго інтарэсаў.

Калі раней амаль усе акцёрскія задачы вырашаліся за кошт пачуццяў, тэмпераменту, дык цяпер на першы план выходзіць паказ працэсу мыслення. Я заўсёды з асалодаю сачу, як гэта робіць вялікі амерыканскі акцёр Спенсер Трэсі. Асабліва ярка аналізуе і раскрывае ён ход думкі ў карцінах Стэнлі Крэймера «Нюрнбергскі працэс» і «Вар'яцкі, вар'яцкі, вар'яцкі свет». Гэты зварот акцёра да свету думак, узмацненне грамадзянскіх матываў у яго творчасці я і лічу асноўнай адзнакай сучаснага стылю.

ПЕРАД КАНЦЭРТАМ. Фота Л. ШАСТАКОВА.

Помнікі нашага краю

Палац у Свяцку



Палац у Свяцку, паблізу Гродна, пабудаваны ў 1779 годзе дойлідам Д. Сако для магната Валовіча, з'яўляецца архітэктурным помнікам пераходнага тыпу. Па архітэктурна-мастацкіх прыёмах палац можна аднесці да эпохі росквіту барока, але шмат дзе ў ім ужо адчуваецца ўплыў класіцызму.

Палац і гаспадарчыя пабудовы, якія адносяцца да яго, размешчаны на рэльефе, перасечаным штучнымі праточнымі вадаёмамі — сажалкамі і каналамі. Парк і вадаёмы ўтвараюць маляўнічы пейзаж на тэрыторыі сядзібы.

Ансамбль у Свяцку мае сіметрычную пабудову і складаецца з трох, звязаных адзін з адным, карпусоў: цэнтральнага, або асноўнага, і двух флігеляў, аб'яднаных з ім паўцыркульнымі галерэямі.

Планіровачная кампазіцыя палаца стварае шырокі парадны двор, які ўзмацняе адкрыты характар загараднага збудавання.

Усе карпусы палаца двухпавярховыя. Цэнтральная частка яго мае больш высокія паверхі і круты дах з мансардамі. Флігелі размешчаны на паніжаным рэльефе, у выніку чаго галерэі, якія звязваюць іх з галоўным будынкам, праходзяць ад першага паверха асноўнага корпуса да другога паверха флігеля. Размяшчэнне карпусоў на рэльефе яшчэ больш падкрэслівае аб'ём цэнтральнай часткі палаца, які становіцца дамінуючым элементам комплексу.

Парадная лесвіца, залы, гасціныя і іншыя лепшыя памяшканні размешчаны ў цэнтральным корпусе палаца. Яго планіроўка вельмі простая: сярэдняя частка адведзена пад трохмаршавую лесвіцу і васьмігранную залу. У банавых частках знаходзяцца малыя залы і кабінеты.

У галоўным корпусе палаца ўжыты, распаўсюджаны для палацавых збудаванняў таго часу, прыём кампазіцыі фасада з трыма банавымі выступамі, якія завяршаюцца выгнутымі франтонамі. У выступах размешчаны высокія паўцыркульныя вокны.

Галоўнае значэнне цэнтра будынка падкрэсліваецца нарашчэннем да яго дэкаратыўнай апрацоўкі фасада, наяўнасцю шырокай лесвіцы ля параднага ўваходу ў палац.

Размяшчэнне больш высокіх парадных памяшканняў у другім паверсе абумовіла падзел фасада палаца на два ярусы: ніжні, трактаваны як цокаль, і верхні. Мансарды з высокім дахам глядзяцца, як трэці ярус фасада.

Пры ўсёй вонкавай параднасці палаца ў ім няма лішніх упрыгожанняў. Яго прыгожы выгляд дасягнуты цікавай кампазіцыяй, прапарцыянальнасцю, стройнасцю і прастатой мастацкіх форм.

Унутраная архітэктура палаца была больш багатая ў параўнанні з вонкавай. Тут архітэктар адмовіўся ад простых вырашэнняў і зрабіў залы і кабінеты розных памераў і форм. У многіх памяшканнях зрэзаны або закруглены вуглы, што таксама з'яўляецца адзнакаю барока.

Свяцкі палац быў пабудаваны каля 1780 года, але работы па ўнутранай дэкарацыі яго ішлі да канца XVIII стагоддзя. Панелі сцен, каміны, рамы для люстраў, мэбля былі зроблены па эскізах і пад кіраўніцтвам Д. Сако.

Асноўнае аздабленне палаца канцэнтравалася на другім паверсе і насіла рысы як барока, так і класіцызму. Сцены галоўнай залы былі ўпрыгожаны калонамі, ліштвы дзвярэй пакрыты прыгожым рэльефам, а ў глыбокіх нішах змяшчаліся каміны са скульптурамі.

У афармленні інтэр'ера былі ўжыты два тыпы дэкарацыі — ляпны і жывапісны. Апошні займаў вялікае месца і быў вельмі разнастайны як па стылі, так і па тэматыцы. У адных выпадках насценны жывапіс адлюстроўваў антычныя статуі, вазоны ў нішах, у другіх — пейзажы.

Цудоўны роспіс інтэр'ера, на жаль, не захаваўся да нашых дзён.

Палац у Свяцку — лепшы ўзор палацавай архітэктуры пераходнага тыпу ад барока да класіцызму ў Беларусі.

Ул. ЧАНТУРЫЯ,
дацэнт кафедры архітэктуры Беларускага політэхнічнага інстытута.

«ТЕАТР» № 6

Чэрвеньская кніжка часопіса «Театр» адкрываецца нататкамі рэдактара Ю. Рыбакова аб выніках сезона.

У раздзеле «Спектаклі» — артыкулы і рэцэнзіі аб чарговых прэм'ерах: «Забаўнік» В. Розава ў Тэатры імя Маскавета, «Шчаўкунчык» П. Чайкоўскага ў Вялікім тэатры, «Ён тройчы клікаў мяне» Р. Райніса ў тэатры драмы Латвійскай ССР, «Звычайная гісторыя» па раману І. Ганчарова ў тэатры «Сучаснік», «Пан Пунціла і яго слуга Мацці» Б. Брэхта ў ЦТСА, «Легенда пра Паганіні» В. Балашова ў Свярдлоўскім тэатры юнага гледача, «Калядны ў доме сіньёра Куп'ела» Эдуарда дэ Філіпа ў Малым тэатры.

У нумары друкуецца вялікі артыкул А. Юфіта «Факты, дакументы, гісторыя», прысвечаны шматтомнаму выданню матэрыялаў і дакументаў па гісторыі савецкага тэатра, якое падрыхтоўваецца да друку.

Артыкул Е. Луцкай «Спадчына сёння» напісаны ў сувязі з пастаноўкай у Вялікім тэатры спектакля «Жарптушкі» ў дэкарацыях А. Галавіна.

«Мая» — так называецца нарыс паэта Андрэя Вазнясенскага пра вядомую балерыну Маю Плісецкую.

Крытык Н. Крымава расказвае пра выдатнага акцёра Сяргея Юрскага. І яшчэ адзін партрэт — артыкул В. Ардава пад назвай «На арэне — артыст Енгібараў».

Драматург Л. Малюгін дзеліцца ў нумары ўспамінамі пра Яўгенія Шварца.

У раздзелах «Кнігі» і «Бібліяграфічныя нататкі» чытач, як заўсёды, знойдзе артыкулы і нататкі аб навінках тэатральнай літаратуры.

У раздзеле «За рубяжом» — артыкул Н. Бярноўскага «Драматычны тэатр і дух музыкі» (з поваду спектакляў Афінскага мастацкага тэатра) і карэспандэнцыя З. Вайновай «Нью-йоркскі тэатр і яго аўдыторыя» і, як звычайна, паведамленні з розных краін.

Нумар завяршаецца п'есай Эдуарда дэ Філіпа «Мастацтва камедыі» ў перакладзе Т. Скуй.

УСМЕШКІ НАШЫХ СЯБРОЎ

ЧЭХАСЛАВАКІЯ Іржы ПІК.

Рэдактар. Я не вельмі ўпэўнены, што мы справядліва абышліся з Новакам. Вершы ў яго зусім неблагія.

Ладзічак. Так, але Слезак іх не рэкамендаваў.

Рэдактар. Мала што гаворыць! Але сёе-тое ў іх ёсць. Трэба было надрукаваць.

Ладзічак. Але Слезак быў супраць...

Рэдактар. Гэты Новак — здольны хлопец. У мяне перад ім сумленне не чыстае. Варта было б яму памагчы.

Ладзічак. Але ж Слезак супраць.

Рэдактар. Вядома, ён мог бы прынесці іх крыху раней. Гэта праўда: вершы пра зіму, а цяпер ужо люты...

Ладзічак. Слезак усё роўна быў бы супраць.

Рэдактар. Апошні верш яму сапраўды не ўдаўся.

Ладзічак. Слезак гаварыў, што і першы, трэці, пяты, восьмы, дзевяты і адзінаццаты.

Рэдактар. Усё-такі адразу відаць, што хлопец таленавіты.

Ладзічак. Слезак гэтага не заўважаў.

Рэдактар. Мы маглі б яго неяк заахвоціць.

Ладзічак. Слезак бы з гэтым не згадзіўся.

Рэдактар. Гм, але вершы пра зіму павінны быць у нумары.

Ладзічак. Гэта можна.

Рэдактар. Што-небудзь у нас ёсць?

Ладзічак. Ёсць адзін верш. Слезака.

Заўвага аўтара. Гэтую сцэнку ў некаторых газетах не хацелі друкаваць. Слезак быў супраць.

Пераклад з чэшскай мовы А. МАЖЭЙКІ.

ПОЛЬШЧА Януш АСЭНКА.

Рэжысёр: — Увага, пачынаем здымаць! Прашу ўсіх у кадр! Больш пяску! Больш, больш! І прашу адразу насыпаць горкі! Увага, там злева яшчэ відаць снег... І каб той снежнай бабы не было на гарызонце! Тут павінен быць пляж, а не зімовы пейзаж! Прашу пазбіваць ледзяшы з дрэў і хутчэй павесіць лісце на галінках. Увага! Юпітэры на сонечныя парасонікі! Здымаем! Стоп! На даху будкі вартаўніка яшчэ ляжыць снег! Скіньце яго шуфлем! Зараз жа! Дзе гэтыя бабкі каля першай горкі? Ды не, бабкі з пяску! Акцёры ў кадр! Прашу класціся загараць! Гэй, вы там! Не пад коўдру, а на коўдру! Увага, камера! Старт!.. Стоп! Акцёр на другім плане! Прашу зняць навушнікі з-пад саламянага капелюша! Гэта вам пляж, а не вар'яцкі дом! Увага, камера! Старт! Наплыў на першую горку! Хутчэй! Стоп! Лыжы пад камерай зноў не змазаны! Панове, варушыцеся, здымкі і так запозненыя! Увага... Не, гэта марнаванне часу і плёнкі. Вы не павінны хукаць на рукі! На экране — гарачы ліпень! Панове міліцыянеры! Колькі разоў я прасіў адагнаць гэтых разявак у кажухах! Увага! Камера! Стоп! Ды не дрыжыце вы так! Прашу ляжаць спакойна, я не сцярплю ніякіх дрыжыкаў! Камера, старт! Наплыў на першую горку! Пані пырскае на вас вадой з шапачкі, вы весела рагочаце! Весялей, весялей! Хутчэй пырскайце, бо вада замярзае! Стоп! Вы не можаце так сінець, фільм каляровы! Грымёр, больш румянаў! Так, робім перапынак, можна накрыцца пледамі. Акцёр на другім плане, вы чаму не ўстаяце? Што, замярзаеце? Дык трыце яго снегам! Не пяском, а снегам — каму я гавару? Хутчэй, бо зараз пачынаем здымаць... Гэй там, на беразе! Адштурхніце жэрдкаю тую ільдзінку! Далей, далей, бо камера панараміруе! Як там з тым замёрзшым? Ужо гатоў? Дык забярыце яго з кадра! Старт! Едзем па пяску праз бабкі, на мяч... Праз бабкі пясочныя... Я хутка звар'яцею! Камера! Старт! Панараміруем на ваду... Стоп... Хвілінку, пачакаем, пакуль пройдзе гэты ледакол... Увага, акцёры ў кадр! Камера старт! Панараміруем ваду... Цяпер акцёр падыходзіць да берагу... Не тупайце так, вы на пляжы, а не на вяселлі... Уваходзьце ў ваду... Глыбей... Глыбей... Не далікатнічаць... Стоп! Так мы ніколі не здымем фільм! Ды страсіце іней з купальнікаў!.. Зрэшты, можаце пакінуць, бо і так снег ідзе... Канец здымак!.. Што за халерны клімат!..

Пераклад з польскага А. МАЖЭЙКІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

31 мая

Першая праграма. 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для школьнікаў. «У бездані». Тэлевізійны спектакль па апавяданню Г. Уэлса. (М). 17.30 — у свеце мастацтва. Рэпартаж з Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Выстаўка узбекскага мастацтва. 17.50 — для дзяцей. «Песні юнацтва». Перадача-канцэрт пра вакальны калектыў «Юнацтва». 18.30 — тэлевізійныя навіны. 18.50 — «Свет сёння» (М). 19.20 — для дзяцей. «Масара Праўда». Спектакль Беларускага тэлебачання. 20.10 — насустрач выбарам у Вярхоўны Савет СССР. Тэлевізійны агітпункт. «Беларусь у новай пяцігодцы». Гутарка другая. Выступленне кандыдата геаграфічных навук У. А. Навіцкага. 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 21.10 — выступаюць удзельнікі Фестывалю беларускага мастацтва ў РСФСР і УзССР. Эстрадны канцэрт. 22.00 — «Турнір дапытлівых». Каляндар-віктарына. 23.00 — «У свеце танца». Тэлевізійны часопіс.

Другая праграма. 11.00 — «Панарама Радзімы» (М). 11.30 — «Пясняр мора». Рэпартаж з Дома-музея Айвазоўскага (М). 12.00 — «Музычны кіёск» (М). 17.30 — «Сельская навіна» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — альманах «Паэзія» (М). 18.50 — «Крышталёвая крыніца». Дакументальны фільм. 19.20 — І. Тургенеў. «Дым». Тэлевізійны спектакль. Перадача з Ленінграда. 20.30 — іграе Ева Эфрон. 21.00 — «Табе, юнацтва!» (М). 21.40 — рашэнні XXIII з'езда КПСС — у жыццё. «З маркай фірмы «Прагрэс». Перадача з Львова. 22.00 — канцэрт ансамбля электраінструментаў Усесаюзнага радыё і тэлебачання (М).

1 чэрвеня

Першая праграма. 16.45 — праграма перадач. 16.50 — канцэрт пераможцаў Мінскага гарадскога агляду школьнай мастацкай самадзейнасці. 18.10 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — «Няхай заўжды будзе сонца!» Да Міжнароднага дня абароны дзяцей (М). 19.00 — насустрач выбарам у Вярхоўны Савет СССР. Тэлевізійны агітпункт. «Беларусь у новай пяцігодцы». Гутарка трэцяя. Выступленне кандыдата геаграфічных навук У. А. Навіцкага. Маленькі канцэрт. 19.30 — першынство СССР па футболу. «Дынама» (Кіеў) — «Спартак» (Масква). Другі тайм. Перадача з Кіева. 20.15 — «Спартыўны гонар». Аб спартсменах Мінскага радыёзавода. 20.35 — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — канцэрт мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 10-годдзю Мінскага Палаца культуры прафсаюзаў. 22.00 — па вашых просьбах. «Паветраны рамізнік». Мастацкі фільм.

Другая праграма. 17.00 — для школьнікаў. «Сто задум двух сяброў» (М). 17.30 — на III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — насустрач выбарам у Вярхоўны Савет СССР. «Нашы кандыдаты». Перадача з Кішынёва. 18.30 — «Чаканне». Кінанавела. 19.00 — праграма Куйбышаўскай студыі тэлебачання (М). 19.30 — «Жыццё, якое кліча да подзвігу». Дакументальны фільм. 20.15 — праграма Куйбышаўскай студыі тэлебачання (працяг) (М). 20.35 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Рэвалюцыі радавы». «Домік у Мінску». Дакументальныя фільмы. 21.00 — праграма Куйбышаўскай студыі тэлебачання (працяг) (М). 21.30 — тэатральныя сустрэчы. «Па сінюю птушку». (М).

2 чэрвеня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для школьнікаў. «Усе наверх!». Перадача з Ленінграда. 17.30 — для школьнікаў. «Ключыць дарогі турысцкія». Расказ выхаванцаў дзіцячай турысцкай экскурсійнай станцыі аб тым, як трэба рыхтавацца да турысцкіх паходаў. 17.50 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — першынство СССР па футболу. «Дынама» (Тбілісі) — «Дынама» (Мінск). Перадача з Тбілісі. У перапынку — тэлевізійныя навіны. 20.00 — тэлевізійныя навіны (М). 20.30 — «Каменная сімфонія». Пра архітэктурныя помнікі Беларусі. Вядзе перадачу дацэнт кафедры архітэктуры БПІ У. І. Чантурыя. 21.05 — расказваюць удзельнікі Фестывалю беларускага мастацтва ў РСФСР і УзССР. Беларускія кампазітары Ул. Алоўнікаў, Д. Камінскі, Ю. Семяняка. 21.55 — ля кінаафішы. Чэрвеньскі экран. 23.00 — «Конна-спартыўнае свята». Тэлерэпартаж. 23.10 — «Пражская вясна». Перадача з Прагі.

СУСТРЭЧА НА ВЫШКАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

— Якім яшчэ прэзідэнтам?

— Ну, свой чалавек.

— А яны не ашукаюць яго, ну, прэзідэнта, як ты кажаш?

— Кінь, дзядзька, лухту малоць! Ён жа прэзідэнт Бе-не-эр...

— Што ты сказаў? — не зразумеў Ціт.

— Ну, што чуеш.

— Я наконт гэтых бэр?

— А... — заўсміхаўся Хвядос, адчуваючы сваю адукаванасць перад малапісьменным дзядзькам. — Гэта па літарах толькі, а поўнасцю будзе так: Беларуская народная рэспубліка.

— Дык жа і цяпер у нас завецца рэспубліка, я ж усё па радыё слухаю.

— Рэспубліка, але якая ж яна народная... А то і прэзідэнт будзе сапраўдны, свой, і парадкі будуць нашы, сапраўдныя... Вер мне, так будзе! — запэўняе Хвядос.

— Табе веру, а ім... — махнуў рукою Ціт, — ніколечкі... Такіх прэзідэнтаў было ўжо. Толькі не трымаліся яны доўга. А мне і немцы былі добрыя...

— Эх, дзядзька, дзядзька, — ці табе ведаць хто найлепшыя нашы прыяцелі? — з роздумам, нібы сам сабе, прыцішана прагаварыў Хвядос.

— Ну, а хто ж? — Ціт наступаў, яго цікавасць да гаворкі з пляменнікам узрастала.

— Ды я ж сказаў ужо — амерыканцы.

— Няхай сабе амерыканцы. Абы толькі хутар свой, зямлі болей, ды каб палякі не захапілі...

— Не захопяць! Тыя беларусы, што за нас, там, за мяжою, пра ўсё падумалі, усё спланавалі...

Ціт не слухае ўважліва, думае. Але верыць і не верыць «вучонаму» пляменніку. А пасля неяк зусім абыякава адмахваецца:

— Аць іх макаўку!

Хвядос жа настойліва, як у той мех, утоптвае сваё:

— Мы павінны падбіраць людзей на новы час, каб гатовымі быць да прыходу сваіх... У нас усё ідзе належным парадкам...

— Няхай сабе, — адмахнуўся Ціт.

— Ну, а пісьмаў не было мне?

— Не, пісьмаў не было... Я б адразу сказаў. А пытацца пра цябе — пыталіся. Толькі хто яны — не сказалі...

— А чаму ж ты не спытаў, хто пытаецца?

— Спрабаваў, але адказалі адным словам — знаёмыя. Ну, як ведаеш, цікавасць залішняя не ў маім характары...

Ціт зноў спрабаваў наліць пляменніку першаку, але той адмовіўся.

А Хвядос выцягнуўся на сене і задумаўся. Ды так, што колькі дзядзька ні загаворвае з ім — маўчыць. Маўчыць і думае. Гэта ж столькі год прайшло, як не быў ён тут, у знаёмых мясцінах, а вандраваў па свеце, па чужых землях, па бруку чужых гарадоў хадзіў, незнаёмую мову слухаў і чужых слухаўся.

Цяпер вось ён, нашпігаваны разведчык, паўпрэд нацыяналістаў і іхняга «ўрада», тут, на гэтай сваёй і не сваёй зямлі, сярод сваіх і не сваіх людзей. Ён паспеў з таго жнівеньскага дня, калі яго скінулі з самалёта, пахадзіць і нешта зрабіць. Гэтае «нешта» ўжо людзям вядома. Можа вядома ім і ўсё астатняе, і вось-вось ён, Хвядос Струк, стане перад вачыма тых, хто будзе яго судзіць за ўсё, па ўсёй суровасці.

Хвядоса ўстурбавала дзядзькава вестка, што пра яго пыталіся. Шукалі «знаёмыя». Хто яны? Свае ці чужыя? Усё, усё акрэслена і ўсё непарушна. Ісці да канца, ніякага паслаблення волі. Толькі дзейнасць. Толькі! І вось ён вылежваецца ў цяпле і справу сваю робіць. Ёсць хоць адзін, але, відаць, пэўны, свой чалавек. І Хвядос рашыў сказаць больш, як дзядзьку. Ён загаварыў:

— За гады, даўгія і кароткія, што мы, дзядзька Ціт, не бачыліся, дзе я толькі ні пабываў...

— А ўсё ж? — узрадаваўся Ціт, што гаворка аднавілася.

Прыкмеціўшы добрыя рыскі ў дзядзькавым настроі, Хвядос зноў сеў, ажывіўся больш чым ад гарэлкі і пачаў гаварыць і гаварыць:

— Пабываў у Польшчы, гэта як паехаў адсюль. Ну, пакуль можна было. Потым у Германію падаўся, на той бок Эльбы. Там нас добра сустрэлі ангельцы, у Лёндан накіравалі, на працу ўладкавалі. Доўга цягнуліся туманныя, дажджлівыя дні. А жылі добра, усё было, што толькі хацелася... Потым зноў у Германію вярнуліся. Запрасілі нашы, з урада беларускага. Гэта ў Мюнхене асеў. Там вучылі... Ух, якая школа...

— Якая? — не стрымаўся Ціт.

— Ну, наіўны ты, дзядзька, вучылі, як з камуністамі ваяваць...

— А-а-а...

— Потым ездзілі ў Берлін, лёталі зноў у Мюнхен, у іншыя, мне нават не вядомыя гарады. З амерыканскімі хлопцамі падружылі... Ну, а потым... Потым на самалёт і сюды...

— І дзе ж вы садзіліся? — стары Ціт быў непасрэдны, як дзіця.

— Х-хы, — усміхаўся Хвядос. — З самалёта і... прама на зямлю. Як з неба...

Ціт здзіўлена глядзіць на пляменніка. Хвядосу адразу ж відаць было, што ў свядомасці старога заварушыўся неспакойны чарвячок боязі, сполаху за нечаканага такога госця. І ён выдаў сябе:

— І адразу сюды, да мяне?

— О, не, дзядзька, мы не з тых, якіх голымі рукамі бяруць. З неба я прызямліўся аж у Занямонні. Там, дзе лес сякуць. Лесарубам папрацаваў. Потым у твой бок падаўся. Па дарозе... на будаўніцтва моста...

— І як цябе, гэта, не пазналі?

— Х-хы, — чмыхнуў Хвядос, — каб пазналі, дык не сядзелі б мы разам ды пяршак твой не каштавалі... — і сам на гэты раз пацягнуўся да кубка, зноў прыгубіў і да носа паднёс цыбуліну. Ціт тым часам адрэзаў кавалак сала і, паклаўшы яго на скібіну хлеба, падаў Хвядосу. Закусвай, маўляў, дарагі госцейка. Але той не ўзяў закусі. І цыбуліну назад палажыў. А гаворку далей павёў, усё больш і больш выхваляючыся сваімі «подзвігамі».

— Мы, дзядзька, умеем іх, радцаў вашых, абводзіць вакол гэтага самага... Дакументы, гэта, у мяне... якія трэба.

Ціт бэкнуў, нешта хочучы запытаць у Хвядоса, але той не даў:

— Запомні, дзядзька, калі што якое — я не Хвядос і не Струк...

— А хто ж? — перапытвае цікаўны Ціт.

Хвядос колькі хвілін пачакаў, а пасля загаварыў:

— Ты ўсё роўна не запомніш... Ну, заві Трахімам, і ўсё... Былы паліцыянт. Адбыў пакаранне — і вольны чалавек цяпер. Калі і зловяць — не страшна. Няхай яшчэ пашлюць... У вас жа тут усе вярнуліся...

— Васіля няма, — уздыхнуў Ціт.

— Вернецца якраз да часу, калі патрэбен будзе...

— От, цяпер разумею, Хвядоска... Разумны ты ў нас. Я так і ведаў, у цябе галава...

— Дык жа Трахім, а не Хвядос, як што такое... зразумеў, дзядзька?

— Ну як жа, усё зразумеў.

Так прагаварылі яны ўвесь канец дня, вечар увесь і ночы прыхапілі. Пляменнік быў рады, што дзядзька — аднадумца яго, што ёсць хоць адзін чалавек, які ў яго верыць, яго разумее. Пад канец Хвядос сказаў:

— Зразумей, запомні: не кожнаму трэба ведаць, пра што я табе казаў, дзядзька. Трымай язык за зубамі ды чакай вясны-красны...

— Ды не маленькі ж я... Разумею...

Пра тое, колькі дзён, колькі часу прабудзе ў дзядзькі, госць ні слова не сказаў. Гэта крыху непакоіла старога. Але зусім спакойны быў Хвядос, які рашыў, што на сене і перазімаваць можна. І няхай дзядзькавы харчы будуць адплатай за яго, Хвядосавы, яму дарункі ваеннага часу.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:
г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, аддзела сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Івану Якаўлевічу Навуменку з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці бацькі.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!
Праверце, ці не заканчваецца ў вас у чэрвені падпіска на газету
«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»?
Прадоўжыць тэрмін падпіскі на другое паўгоддзе лепш загадзя, не адкладаючы на апошнія дні чэрвеня.
Падпіска прымаецца ўсімі ўстановамі «Саюздруку», сувязі, а таксама грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку па месцы работы або вучобы.

Друкарня выдавецтва «Звязда»
Індэкс 63856. АТ 00934